iSANS | The International Strategic Action Network for Security

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ

**Агляд асноўных падзей і тэндэнцый за лістапад 2024 года**

**Гэтае даследаванне ўяўляе сабой агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам лістапада 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці.**

У лістападзе былі выяўлены такія тэндэнцыі:

- **Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры афіцыйных беларускіх уладаў па-ранейшаму застаецца амаль цалкам манапалізаваным Расіяй.**

  У лістападзе 2024 года ў Telegram-канале Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі змешчаны 99 арыгінальных навін (у папярэдніх двух месяцах — 83 і 103), якія тычацца міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры.

| **Краіна** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Расія | 66 (у папярэдніх двух месяцах — 71 і 41) |
| Таджыкістан | 12 |
| Некалькі краін адразу | 3 |
| Кітай | 9 |
| Зімбабвэ | 2 |
| Сербія | 2 |
| Турцыя | 1 |
| Узбекістан | 1 |
| Казахстан | 1 |
| Індыя | 1 |
| Кыргызстан | 1 |

Галоўным для Беларусі партнёрам у культурнай сферы па-ранейшаму застаецца Расійская Федэрацыя. У лістападзе прайшлі шматлікія супольныя беларуска-расійскія мерапрыемствы, сярод якіх: круглы стол, прысвечаны развіццю кінематографа ў Саюзнай дзяржаве[1], мерапрыемства Саюзнай дзяржавы «Фестываль творчасці інвалідаў “Разам мы зможам больш”» [2,3,4,5,6,7,8,9,10,11,12,13], III Адкрытыя маладзёжныя Арктычныя Дэльфійскія гульні[14,15,16,17,18], канцэрты, выставачныя праекты і тэатральныя пастаноўкі. Адбылося падпісанне шэрагу пагадненняў між установамі культуры Беларусі і Амурскай вобласці[19].

[1] https://t.me/minkultrb/44419
[2] https://t.me/minkultrb/44973
[3] https://t.me/minkultrb/44999
[4] https://t.me/minkultrb/45026
[5] https://t.me/minkultrb/45042
[6] https://t.me/minkultrb/45098
[7] https://t.me/minkultrb/45125
[8] https://t.me/minkultrb/45168
[9] https://t.me/minkultrb/45178
[10] https://t.me/minkultrb/45227
[11] https://t.me/minkultrb/45241
[12] https://t.me/minkultrb/45243
[13] https://t.me/minkultrb/45252
[14] https://t.me/minkultrb/45729
[15] https://t.me/minkultrb/45777
[16] https://t.me/minkultrb/45783
[17] https://t.me/minkultrb/45792
[18] https://t.me/minkultrb/45812
[19] https://t.me/minkultrb/44946

Таксама можна гаварыць пра намаганні беларускіх уладаў наладзіць стасункі (ў тым ліку культурніцкія) з усходнімі і афрыканскімі краінамі. Пра гэта сведчыць шырокае асвятленне Дзён культуры Беларусі ў Таджыкістане[20,21,22,23,24,25,26]. Быў падпісаны «План мерапрыемстваў аб узаемадзеянні ў сферы культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Казахстан на 2025-2026 гг.»[27].

Што тычыцца супрацоўніцтва з заходнімі краінамі, то цягам месяца такіх выпадкаў ізноў не было зафіксавана.

- **Расія, (пра)расійскія арганізацыі і актывісты не спыняюць сваю актыўнасць, праводзячы ў Беларусі экспансію расійскай культуры і рускай мовы і ствараючы падмурак для далейшай інтэграцыі праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг і г. д.**

У перыяд з 1 па 30 лістапада 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- дамоўленасці аб супрацоўніцтве** паміж: Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі[28], Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і Віцебскай абласной бібліятэкай імя Леніна[29].

**- навязванне рускай мовы і літаратуры:** адкрыццё Цэнтра дадатковай адукацыі на базе Рускага Дома ў Мінску[30], Міжнародны маладзёжны форум «Будучыня рускага свету»[31], Вялікая этнаграфічная дыктоўка[32,33], цыкл лекцый, прысвечаных рускай класічнай літаратуры[34], комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі дадатковай адукацыйнай праграмы «Руская мова як аснова сацыякультурнага праектавання ў сучаснай адукацыйнай прасторы»[35,36,37], цыкл лекцый, прысвечаных рускай класічнай літаратуры[38], новы праект Рускага Дома «Літаратурнае кафэ»[39], творчыя сустрэчы з расійскімі пісьменнікамі[40], перадача ў дар больш за 500 выданняў класічнай і сучаснай рускай літаратуры[41], сустрэча размоўнага клуба «Рускі як замежны»[42,43], выставы да 225-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Пушкіна[44] і памяці Фёдара Цютчава[45,46].

**- папулярызацыя савецкай эпохі і праслаўленне ВАВ:** прэзентацыя праекта «Кніга Памяці. Рэспубліка Беларусь. Мінск і Мінская вобласць»[47], кінапаказы ваенных фільмаў

[20] https://t.me/minkultrb/45762
[21] https://t.me/minkultrb/45772
[22] https://t.me/minkultrb/45779
[23] https://t.me/minkultrb/45781
[24] https://t.me/minkultrb/45785
[25] https://t.me/minkultrb/45814
[26] https://t.me/minkultrb/45826
[27] https://t.me/minkultrb/45157
[28] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15552
[29] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15688
[30] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15680
[31] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15483
[32] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15456
[33] https://t.me/russkiydomvgrodno/2322
[34] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15470
[35] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15532
[36] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15572
[37] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15537
[38] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15531
[39] https://t.me/rcnkbrest/25308
[40] https://t.me/russkiydomvgrodno/2393
[41] https://t.me/russkiydomvgrodno/2411
[42] https://t.me/russiangomel/5478
[43] https://t.me/russiangomel/5488
[44] https://t.me/russiangomel/5535
[45] https://t.me/russkiydomvgrodno/2473
[46] https://t.me/russkiydomvgrodno/2487
[47] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15323

у рамках XXX Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»[48,49], аўтапрабег, прысвечаны 81-й гадавіне вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[50], конкурс сачыненняў «Без тэрміну даўнасці»[51], адкрыццё «Восьмых Давыдаўскіх чытанняў»[52,53,54], паход па мясцінах, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны на зямлі Брэстчыны[55], выстава «Бітва за Маскву. Неўміручасць подзвігу»[56].

**- канцэрты і фестывалі:** святочныя канцэрты, прысвечаныя Дню народнага адзінства Расіі[57,58,59,60,61,62], святочны вечар, прысвечаны 30-годдзю «Рускага таварыства»[63], расійска-беларускі музычны праект «Чароўныя гукі арфы»[64].

**- тэматычныя клубы і сустрэчы:** заснаванне Гістарычнага клуба ў Мінску[65,66], цыкл сустрэч з начальнікам аддзела «Галоўны штаб» Дзяржаўнага Эрмітажа Аляксандрам Дыдыкіным[67], творчыя сустрэчы з расійскімі дзеячамі культуры і мастацтва Аляксандрам Іншаковым і Наталляй Варлей[68], сустрэчы ў рамках праекта «Культурны код народаў Расіі і Беларусі»[69,70], культурна-адукацыйны і навуковы форум «Славянскія сустрэчы»[71,72].

**- папулярызацыя расійскага кіно:** паказ фільма RT Documentary «Чаму я пераехаў у Расію?»[73], дабрачынная акцыя «Кіно дзецям»[74], прэм'ерны паказ дакументальнага фільма «Дзве Еўфрасінні: Радасць зямлі Рускай»[75], паказ расійскага фільма «Легенды вечных снягоў»[76], праект «Кінаўрокі ў школах Расіі і свету» ў Гродзенскай вобласці[77].

**- выставы:** «Народаў шмат — Радзіма адна» напярэдадні Дня народнага адзінства Расіі[78,79,80], «Ветлужскія Эцюды»[81,82,83,84].

- **Працягваецца працэс уніфікацыі гістарычных навук Беларусі і Расіі.**

  - згодна з дакументамі, падрыхтаванымі Расійскім інстытутам стратэгічных даследаванняў, расійскія чыноўнікі намагаюцца перапісаць гісторыю Беларусі ў сваіх інтарэсах. У распараджэнне беларускіх журналістаў-расследавальнікаў «Бюро Медыя»

---

48 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15390
49 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15472
50 https://t.me/russiangomel/5489
51 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15660
52 https://t.me/russkiydomvgrodno/2495
53 https://t.me/russkiydomvgrodno/2506
54 https://t.me/russkiydomvgrodno/2527
55 https://t.me/rcnkbrest/25353
56 https://t.me/rcnkbrest/25383
57 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15438
58 https://t.me/russiangomel/5414
59 https://t.me/russiangomel/5416
60 https://t.me/russkiydomvgrodno/2320
61 https://t.me/russkiydomvgrodno/2332
62 https://t.me/rcnkbrest/25084
63 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15395
64 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15357
65 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15428
66 https://t.me/russkiydomvgrodno/2528
67 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15383
68 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15337
69 https://t.me/rcnkbrest/25255
70 https://t.me/rcnkbrest/25322
71 https://t.me/russiangomel/5494
72 https://t.me/russiangomel/5504
73 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15392
74 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15405
75 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15437
76 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15485
77 https://t.me/russkiydomvgrodno/2442
78 https://t.me/russiangomel/5367
79 https://t.me/russiangomel/5377
80 https://t.me/russiangomel/5415
81 https://t.me/russkiydomvgrodno/2293
82 https://t.me/russkiydomvgrodno/2304
83 https://t.me/russkiydomvgrodno/2307
84 https://t.me/russkiydomvgrodno/2321

трапілі копіі аналітычных запісак за 2022-2024 гады па гістарычнай палітыцы Беларусі, падрыхтаваных Расійскім інстытутам стратэгічных даследаванняў (РІСД). У інтарэсах Расіі *«фарміраванне гістарычнай самасвядомасці беларусаў як прадстаўнікоў рускай цывілізацыі, а не як тых, хто жыве паміж Усходам і Захадам»,* — сказана ў аналітычнай запісцы за гэты год. Расійскі інстытут падрыхтаваў падрабязную інструкцыю, як гэтага дабіцца. Сярод мерапрыемстваў, прапісаных у інструкцыі, — увядзенне новага свята — Дня адзінства. Святкаваць яго прапануюць 24 кастрычніка, у дзень, калі ў 1795 годзе быў праведзены трэці падзел Рэчы Паспалітай, і беларускія землі канчаткова ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі[85,86].

- з Расіі прыехала выкрываць «міф пра Курапаты» гісторык, якая перапісвае гісторыю Катынскага расстрэлу на карысць чэкістаў[87].

- тым часам дэпутата Ігара Марзалюка раздражняе мантра «у нас єдиная історія, у нас єдиный язык»[88].

- **Назіраецца павышаная ўвага дзяржавы да нацыянальнай гістарыяграфіі.**
  Беларускія ўлады няспынна перапісваюць гісторыю Беларусі згодна з найноўшымі ідэалагічнымі наратывамі і ва ўгоду беларуска-расійскай інтэграцыі, бяруць пад татальны кантроль любы распаўсюд гістарычных ведаў.

  - з Лошыцкага яра знік крыж ахвярам бальшавіцкага тэрору[89].

  - начальнік аддзела падрыхтоўкі выступленняў Адміністрацыі Лукашэнкі Радзіна-Карачэўская прааналізавала ўплыў «міфа аб Каліноўскім» на палітычную сітуацыю ў краіне ў розныя перыяды[90].

- **У ідэалагічнай сферы адбываецца сакралізацыя савецкага мінулага, вялікая ўвага па-ранейшаму надаецца тэме Вялікай айчыннай вайны. Тым часам мае месца быць антызаходняя рыторыка:**

  - у Гомелі з’явіцца чарговы «ваенны» мурал[91].

  - у Мінскім гарадскім судзе вынеслі першы прысуд у Беларусі за «адмаўленне генацыду беларускага народу»[92,93].

  - Нацыянальная бібліятэка Беларусі павіншавала падпісчыкаў свайго тэлеграм-канала з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі вершам рускага паэта Сяргея Ясеніна[94].

  - на міжнародным форуме ў Мінску абмяркоўвалі Дэградацыю еўрапейскай культуры[95].

  - школьнікаў у Гомельскай вобласці водзяць па разнарадцы на новы мультфільм, у якім «культ замежнай нячыстай сілы» замяняюць айчынным[96].

---

[85] https://buromedia.io/be/news/istoriya-belarusi-na-rossiyskiy-lad
[86] https://nashaniva.com/356253
[87] https://nashaniva.com/354535
[88] https://nashaniva.com/355787
[89] https://nashaniva.com/354585
[90] https://t.me/Gigin_Vadim/2625
[91] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/gorad/v-gomele-pojavitsja-ocherednoj-voennyj-mural-v-chest-repressirovannogo-komandira-kotoryj-podvergalsja-pytkam-nkvd.html
[92] https://t.me/viasna96/28415
[93] https://www.svaboda.org/a/33188605.html
[94] https://t.me/libraryofbel/5318
[95] https://ctv.by/news/obshestvo/degradaciyu-evropejskij-kultury-obsuzhdali-na-mezhdunarodnom-forume-v-minske
[96] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/naviny/kult-inostrannoj-nechistoj-sily-zamenjajut-otechestvennym-shkolnikov-v-gomelskoj-oblasti-vodjat-po-raznarjadke-na-novyj-multfilm.html

- мінскія ўлады прадпісваюць упрыгожваць навагоднія вітрыны толькі «элементамі славянскага паходжання» і забараняюць уключаць у мінскіх гандлёвых цэнтрах і кавярнях сусветныя навагоднія хіты[97,98].

- **Па-ранейшаму назіраецца папулярызацыя рускай мовы і стварэнне адзінай (руска)моўнай прасторы.**

  За лістапад 2024 года афіцыйны тэлеграм-канал[99] Міністэрства культуры апублікаваў 408 навін (у папярэдніх двух месяцах — 302 і 429). Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 328 |
| Беларуская | 66 |
| Абедзве | 14 |

  - прарасійскія актывісты разам з Вольгай Бондаравай зноў змагаліся з беларускай мовай у гарадской прасторы[100].

  - у «экстрэмісцкі» спіс дадалі лагатып Telegram-каналу «Šufliadka» — літару «Š» з беларускага лацінскага алфавіту Мінінфарм назваў «польскай»[101].

- **Беларуская нацыянальная культура ўсё больш прывязваецца да расійскай і працягвае існаваць ва ўмовах рэпрэсій і забарон.**

  ***Беларуская літаратура:***

  - Міністэрства інфармацыі запатрабавала зняць з продажу выданні, якія «наносяць шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі»[102] і склала спіс з 35 «шкодных» кніг[103,104,105,106,107].

  ***Нацыянальная кінаіндустрыя:***

  - на Мінскі Міжнародны фестываль «Лістапад» прыехаў цэлы россып расійскіх кінематаграфістаў[108].

  - дырэктар «Масфільма» лічыць, што кінематаграфісты Беларусі павінны мець магчымасць фінансавання ў Расіі[109].

---

[97] https://nashaniva.com/356363
[98] https://nashaniva.com/356410
[99] https://t.me/MinobrofBelarus
[100] https://nashaniva.com/355037
[101] https://t.me/viasna96/28434
[102] https://www.svaboda.org/a/33200264.html
[103] http://mininform.gov.by/documents/spisok-pechatnykh-izdaniy-soderzhashchikh-informatsionnye-soobshcheniya-i-ili-materialy-rasprostrane/
[104] https://reformby.org/mininform-zapretil-35-pechatnyh-izdanij
[105] https://nashaniva.com/355834
[106] https://www.svaboda.org/a/33211961.html
[107] https://reformby.org/markov-hochet-nemnozhko-ochistitsja-literatury-rasshativajushhej-iskonnye-nacionalnye-ustoi
[108] https://reformby.org/back-in-ussr-na-festyvali-listapad-prajshli-sustrjechy-z-svjatlanaj-druzhyninaj-karjenam-shahnazaravym-mikalaem-burljaevym
[109] https://belta.by/culture/view/direktor-mosfilma-kinematografisty-belarusi-dolzhny-imet-vozmozhnost-finansirovanija-v-rossii-672629-2024/

- «Беларусьфільм» прыйшоў да пагаднення аб сумеснай кінавытворчасці з «Ленфільмам»[110].

- мінскі «Кінавідэапракат» і «Таджыкфільм» падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве[111].

- кітайскія кінематаграфісты хочуць развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю[112].

- на «Лістападзе» адбыўся Дзень індыйскага кіно[113,114,115], прайшлі Дзень кіно Узбекістана[116] і Дзень якуцкага кіно[117].

***Нацыянальны тэатр:***

- у РТБД мелі месца масавыя звальненні акцёраў[118,119,120,121].

- пластычны тэатр «ІнЖэст» страціў памяшканне для рэпетыцый[122].

- у Купалаўскім тэатры адбылася першая прэм’ера сезона. Гэта трагікамедыя Дастаеўскага з Няфёдавай у галоўнай ролі ў пастаноўцы расійскага рэжысёра[123].

**Гэтыя тэндэнцыі могуць мець для Беларусі сур’ёзныя наступствы, паколькі яны накіраваны на страту яе самабытнасці, на стварэнне ўмоў для далейшай інтэграцыі з Расіяй. А пры адначаснай экспансіі расійскай культуры — і на знікненне ў ёй. Беларусь паступова страчвае сваю нацыянальную індывідуальнасць.**

---

[110] https://belta.by/culture/view/direktor-belarusfilma-my-prishli-k-soglasheniju-o-sovmestnom-kinoproizvodstve-s-lenfilmom-673193-2024/
[111] https://t.me/sbbytoday/133154
[112] https://reformby.org/pazdymac-na-fone-velmi-prygozhyh-pejzazha-kitajskija-kinematagrafisty-hochuc-razvivac-supraco-nictva-z-belarussju
[113] https://www.sb.by/articles/na-listapadze-sostoyalsya-den-indiyskogo-kino-.html
[114] https://belta.by/society/view/posol-indii-u-nashih-stran-ochen-moschnoe-sotrudnichestvo-v-oblasti-kinematografii-672871-2024/
[115] https://t.me/minkultrb/44489
[116] https://sb-by.turbopages.org/sb.by/s/articles/na-yubileynom-xxx-minskom-mezhdunarodnom-kinofestivale-proshel-den-kino-uzbekistana-i-pokaz-filma-uz.html
[117] https://belta-by.turbopages.org/belta.by/s/culture/view/den-jakutskogo-kino-proshel-v-kinoteatre-pobeda-673962-2024/
[118] https://t.me/viasna96/28360
[119] https://nashaniva.com/354496
[120] https://nashaniva.com/354748
[121] https://nashaniva.com/355400
[122] https://nashaniva.com/355701
[123] https://nashaniva.com/355964

**З Лошыцкага яра знік крыж ахвярам бальшавіцкага тэрору, з Расіі прыехала выкрываць «міф пра Курапаты» гісторык, якая перапісвае гісторыю Катынскага расстрэлу на карысць чэкістаў, у Гомелі з’явіцца чарговы «ваенны» мурал, у Мінскім гарадскім судзе вынеслі першы прысуд у Беларусі за «адмаўленне генацыду беларускага народу», Нацыянальная бібліятэка Беларусі павіншавала падпісчыкаў свайго тэлеграм-канала з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі вершам рускага паэта Сяргея Ясеніна, у Мінску прайшоў кірмаш «Зроблена ў Тульскай вобласці», на Мінскі Міжнародны фестываль «Лістапад» прыехаў цэлы россып расійскіх кінематаграфістаў, дырэктар «Масфільма» лічыць, што кінематаграфісты Беларусі павінны мець магчымасць фінансавання ў Расіі, «Беларусьфільм» прыйшоў да пагаднення аб сумеснай кінавытворчасці з «Ленфільмам», Мінскі «Кінавідэапракат» і «Таджыкфільм» падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве, кітайскія кінематаграфісты хочуць развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю, на «Лістападзе» адбыліся Дзень індыйскага кіно, Дзень кіно Узбекістана і Дзень якуцкага кіно, прарасійскія актывісты разам з Вольгай Бондаравай зноў пачалі абурацца беларускай мовай у горадзе, Мінінфарм назваў літару «Š» з беларускага лацінскага алфавіту «польскай», у Гомелі з’явіліся афішы гастроляў драматычнага тэатра з ЛНР, трох самых зорных акцёраў РТБД звольнілі з тэатра, арыштаваны спявак Дзядзя Ваня — навіны культуры за перыяд 1-10 лістапада 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 1-10 лістапада 2024 года на афіцыйным сайце[124] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 3 навіны, якія былі прысвечаны: рабочаму візіту ў Рагачоў міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатоля Маркевіча[125], урачыстаму ўшанаванню народнага артыста Беларусі Ігара Алоўнікава[126], пасяджэнню камісіі па супрацьдзеянні карупцыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь[127]. Афіцыйны тэлеграм-канал[128] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 121 навіну. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 85 |

[124] https://www.kultura.by/

[125] https://www.kultura.by/news/31-oktyabrya-ministr-kultury-respubliki-belarus-anatoliy-mechislavoviya-markevich-nakhodilsya-s-rabo/
[126] https://www.kultura.by/news/u-belaruskay-dzyarzha-nay-filarmonii-adbylosya-rachystae-shanavanne-narodnaga-artysta-belarusi-igara/
[127] https://www.kultura.by/news/13-noyabrya-2024-g-v-11-chasov-00-minut-sostoitsya-zasedanie-komissii-po-protivodeystviyu-korruptsii/
[128] https://t.me/MinobrofBelarus

| | |
|---|---|
| Беларуская | 31 |
| Абедзве | 5 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 23 навіны;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 9 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 39 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***

- выступіў на семінары для рэзерву кіруючых работнікаў галіны, які адбыўся ў Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя Глебава. Па словах міністра, беларуская культура і людзі, якія ствараюць яе сваёй працай, з'яўляюцца буферам для негатыву, што спрабуюць закінуць у краіну звонку[129].

- накіраваў калектыву музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля віншаванне з нагоды 105-годдзя з дня ўтварэння музея[130].

- накіраваў прывітальнае слова арганізатарам і ўдзельнікам XXII Міжнароднага фестывалю дзіцячай творчасці «Залатая пчолка»[131].

- выступіў на цырымоніі адкрыцця XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» у Палацы Рэспублікі[132]. *«Важныя вектары развіцця беларускага кінематографа — гэта сумесная работа з іншымі краінамі і выхад на знешнія рынкі, каб паказваць нашу краіну, нашы традыцыйныя каштоўнасці. Здаецца, яны непарушныя, але ў свеце існуюць іншыя павевы. У процівагу мы павінны паказваць самае мудрае і каштоўнае, што ёсць у нашай роднай Беларусі»,* — сказаў Анатоль Маркевіч[133].

- наведаў Бенефіс народнага артыста Беларусі Т. А. Кокштыса ў гонар яго 90-годдзя (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа)[134,135,136].

- накіраваў прывітальнае слова ўдзельнікам святочнага канцэрта, які адбыўся з нагоды Дня ўтварэння падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь у вайсковай часці 3214[137].

---

129 https://t.me/minkultrb/44277
130 https://t.me/minkultrb/44310
131 https://t.me/minkultrb/44335
132 https://t.me/minkultrb/44354
133 https://belta.by/culture/view/markevich-vazhnyj-vektor-razvitija-belorusskogo-kinematografa-vyhod-na-vneshnie-rynki-672731-2024/
134 https://t.me/minkultrb/44396
135 https://t.me/minkultrb/44420
136 https://t.me/minkultrb/44462
137 https://t.me/minkultrb/44445

- прыняў удзел ва ўрачыстым ушаноўванні народнага артыста Беларусі, прафесара Ігара Алоўнікава, прымеркаваным да яго 70-годдзя, у Беларускай дзяржаўнай філармоніі[138,139], дзе таксама зазірнуў на рэпетыцыю канцэрта «Класіка без межаў» Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь[140].

- правёў прыём грамадзян па пытаннях удзелу ў культурным жыцці краіны, рабоце аматарскіх калектываў[141].

- сустрэўся з сербскай актрысай, рэжысёрам Іванай Жыган для абмеркавання новага кінапраекта[142].

- узяў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі мадэрнізаванай транспартнай сістэмы адраснай дастаўкі кніг «Тэлеліфт»[143,144].

***Першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада:***

- прыняў удзел у прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да адкрыцця XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»[145].

- выступіў мадэратарам круглага стала «Перспектывы развіцця кінаіндустрыі на постсавецкай прасторы»[146].

- прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі да 85-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея[147].

***Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Сяргей Саракач:***

- звярнуўся з прывітальным словам да гасцей конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» у кінатэатры «Піянер»[148].

***Начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга:***

- прыняла ўдзел у цырымоніі закрыцця XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»[149].

***Начальнік аддзела бюджэтнага фінансавання Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Тацяна Афанасьева:***

[138] https://t.me/minkultrb/44547
[139] https://t.me/minkultrb/44653
[140] https://t.me/minkultrb/44659
[141] https://t.me/minkultrb/44748
[142] https://t.me/minkultrb/44757
[143] https://t.me/minkultrb/44762
[144] https://t.me/minkultrb/44765
[145] https://t.me/minkultrb/44264
[146] https://t.me/minkultrb/44460
[147] https://t.me/minkultrb/44704
[148] https://t.me/minkultrb/44389
[149] https://t.me/minkultrb/44842

- правяла «прамую тэлефонную лінію» па пытаннях бюджэтнага фінансавання ў сферы культуры[150].

***Намеснік начальніка аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Крысціна Мельнікава:***

- прыняла ўдзел у прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да адкрыцця XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»[151].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшло пленарнае пасяджэнне XXXVIII навуковай канферэнцыі «Каласавіны», прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 65-годдзю музея[152].

- мабільная экспазіцыя «Наш абавязак — памятаць!» Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прыняла гасцей на фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2024» у горадзе Масты[153].

- у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася выстава «Страты і здабыцці. Лёс мастацкіх каштоўнасцей Дзяржаўнай Карціннай галерэі. 1939-1957». Экспазіцыя прымеркавана да 80-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 85-годдзя з дня заснавання музея[154,155].

- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся ўрачысты сход Рэспубліканскага форума «Памяць пакаленняў у імя будучыні». У рамках форума адбылася цырымонія ўшаноўвання ўстаноў і грамадскіх аб’яднанняў за актыўную дзейнасць па захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне[156].

- супрацоўнікі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прадставілі настольную гульню «Вызваленне Беларусі». Гульня спалучае ў сабе элементы стратэгіі і адукацыйнага працэсу, *«дазваляючы ўдзельнікам не толькі развіваць тактычныя навыкі, але і пагрузіцца ў вялікую гісторыю сваёй краіны»*[157].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 39 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 27 навін;

Кітай — 5 навін;

Некалькі краін адразу — 3 навіны;

Зімбабвэ — 2 навіны;

[150] https://t.me/minkultrb/44268
[151] https://t.me/minkultrb/44264
[152] https://t.me/minkultrb/44260
[153] https://t.me/minkultrb/44375
[154] https://t.me/minkultrb/44482
[155] https://t.me/minkultrb/44701
[156] https://t.me/minkultrb/44668
[157] https://t.me/minkultrb/44828

Турцыя — 1 навіна;

Узбекістан — 1 навіна.

***Расія:***

- народны ансамбль цымбалістаў «Гарэзлівыя переразвоны» Цэнтра культуры «Віцебск» даў канцэрт на XIV Міжнародным фестывалі нацыянальных культур «Сінегор'е» (г. Коркіна, Расія)[158,159].

- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў круглы стол, прысвечаны развіццю кінематографа ў Саюзнай дзяржаве. Удзел прынялі: кіраўніцтва Міністэрства культуры, кінастудыі «Беларусьфільм», Беларускага саюза кінематаграфістаў, народныя артысты Расіі, старшыня Камісіі Парламенцкага сходу Расіі і Беларусі па культуры, навуцы і адукацыі Мікалай Бурляеў, кіраўнікі «Масфільма», «Ленфільма», кінастудыі «Лендак»[160].

- у рамках XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» адбыўся круглы стол «Перспектывы развіцця кінаіндустрыі на постсавецкай прасторы». У яго працы прынялі ўдзел генеральны дырэктар кінаканцэрна «Масфільм», народны артыст Расіі Карэн Шахназараў, генеральны дырэктар кінастудыі «Ленфільм» Эдуард Сувораў, генеральны дырэктар ТАА «Студыя "Ваенфільм"», народны артыст Расіі Ігар Угольнікаў, кінарэжысёр Сяргей Урсуляк, генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Аляксей, старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Яўген Арэндарэвіч, кіраўнікі кінакампаній Беларусі і Расіі. На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні сумеснай фільмавытворчасці і распаўсюджвання фільмаў[161].

- Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы прадставіў спектакль «Жаніцьба» на XXVIII Міжнародным фестывалі тэатральных мастацтваў імя Ф. М. Дастаеўскага ў Вялікім Ноўгарадзе[162].

- у горадзе Новакуйбышаўску Самарскай вобласці Расіі адкрылася выстава Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы «Ты далёка. Ты блізка. Ты побач»[163].

- стала вядома, што 11 лістапада Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. М. Горкага прыме ўдзел у II Міжнародным тэатральным фестывалі «Дастаеўскі. Омск» (г. Омск, Расія) са спектаклем «Ідыёт» Ф. Дастаеўскага, рэжысёр-пастаноўшчык — Івана Жыган (Сербія). Паказ пройдзе на сцэне Омскага драматычнага тэатра «Галёрка»[164].

***Кітай:***

- Беларусь прыняла ўдзел у мерапрыемствах сёмай Кітайскай міжнароднай выставы імпарту ў г. Шанхаі (КНР). У рамках Нацыянальнай экспазіцыі прайшла культурная

[158] https://t.me/minkultrb/44288
[159] https://t.me/minkultrb/44472
[160] https://t.me/minkultrb/44419
[161] https://t.me/minkultrb/44460
[162] https://t.me/minkultrb/44553
[163] https://t.me/minkultrb/44759
[164] https://t.me/minkultrb/44880

праграма[165,166,167].

***Некалькі краін адразу:***

- у Клімавічах урачыста адкрылі XXII Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка». На свята прыехалі юныя таленты з Расіі, Азербайджана і Узбекістана[168].

***Зімбабвэ:***

- у сталічным кінатэатры «Перамога» падчас фестывальнага тыдня адбыўся Дзень кіно Зімбабвэ. Гледачам быў прадэманстраваны фільм «Убач мяне», які апавядае пра маладых людзей, якія жывуць з ВІЧ і СНІД[169,170].

***Турцыя:***

- адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы калекцыі кніг у дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ад Пасольства Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь. У мерапрыемстве прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Гючлю Джэм Ышык і генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін, а таксама супрацоўнікі дыпламатычнага прадстаўніцтва Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь[171].

**На што яшчэ варта звярнуць увагу:**

- шырокае (44 паведамленні) асвятленне XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»[172,173,174,175,176,177,178,179,180,181,182 і г.д.].

- шырокае (13 паведамленняў) асвятленне акцыі «Марафон адзінства» ў Пінску[183]. Сярод мерапрыемстваў:

- перасоўная выстава «Наш абавязак — памятаць!» Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[184].

---

[165] https://t.me/minkultrb/44649
[166] https://t.me/minkultrb/44797
[167] https://t.me/minkultrb/44811
[168] https://t.me/minkultrb/44336
[169] https://t.me/minkultrb/44610
[170] https://t.me/minkultrb/44611
[171] https://t.me/minkultrb/44682
[172] https://t.me/minkultrb/44264
[173] https://t.me/minkultrb/44271
[174] https://t.me/minkultrb/44296
[175] https://t.me/minkultrb/44302
[176] https://t.me/minkultrb/44316
[177] https://t.me/minkultrb/44318
[178] https://t.me/minkultrb/44343
[179] https://t.me/minkultrb/44349
[180] https://t.me/minkultrb/44351
[181] https://t.me/minkultrb/44361
[182] https://t.me/minkultrb/44496
[183] https://t.me/minkultrb/44833
[184] https://t.me/minkultrb/44760

- экспазіцыя «Кнігі ў дар Прэзідэнту» ў Музеі беларускага Палесся ў Пінску. На выставе больш за 20 выданняў, падораных Аляксандру Лукашэнку кіраўнікамі іншых дзяржаў. У тым ліку Турцыі, Таджыкістана, Зімбабвэ, Азербайджана[185,186].

- святкаванне Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. *«Падзеі восені 1917 года прымусілі свет пачуць голас народа, які смела і адкрыта заявіў аб сваёй шматвяковай мары. Аб'ява аб стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі стала сапраўды ўрачыстасцю гістарычнай справядлівасці»,* — адзначыў Аляксандр Лукашэнка[187].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову, перадаюць установам адукацыі і культуры камплекты кніг.

У перыяд з 1 па 10 лістапада 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- Міжнародны маладзёжны форум «Будучыня рускага свету»** *(Масква).* Форум пройдзе з 3 па 8 снежня. Да ўдзелу запрашаюцца расійскія суайчыннікі, якія пражываюць за мяжой. Удзельнікаў чакаюць дыскусіі, майстар-класы, творчыя сустрэчы, круглыя сталы і практыкумы. Па выніках мерапрыемстваў тры маладыя суайчыннікі атрымаюць узнагароды Маскоўскага Дома суайчынніка за ўклад у развіццё руху маладых расійскіх суайчыннікаў у 2024 годзе па наступных намінацыях: «Культурны код: за прасоўванне рускай культуры і рускай мовы за мяжой»; «Медыягерой: за ўклад у падтрымку і развіццё рускіх медыя за мяжой»; «Захавальнік рускай спадчыны: за стварэнне і прасоўванне праграм па захаванні гістарычнай памяці за мяжой»[188].

**- заснаванне Гістарычнага клуба** *(Рускі Дом у Мінску).* Праца клуба будзе накіравана на папулярызацыю гістарычнай спадчыны, а таксама павышэнне гістарычнай пісьменнасці моладзі. У складзе клуба — прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, святары, пісьменнікі, даследчыкі, супрацоўнікі навуковых устаноў Расіі і Беларусі. Узначаліў супольнасць Аляксандр Гронскі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра постсавецкіх даследаванняў Нацыянальнага даследчага інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін ім. Прымакова Расійскай акадэміі навук. У рамках працы Гістарычнага клуба запланаваны лекцыі, дыскусіі, кінапаказы, выставы і іншыя інтэрактыўныя мерапрыемствы[189]. Першае мерапрыемства клуба было прымеркавана да святкавання Дня заснавання Расійскага ваенна-марскога флоту[190].

**- цыкл сустрэч з Аляксандрам Дыдыкіным** *(Мінскае суворАўскае ваеннае вучылішча, Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь і Універсітэт грамадзянскай абароны МНС Рэспублікі Беларусь).* Аляксандр Дыдыкін — начальнік аддзела «Галоўны штаб» Дзяржаўнага Эрмітажа, збіральнік, аўтар і выканаўца рускіх ваенных рамансаў і палкавых

[185] https://t.me/minkultrb/44834
[186] https://t.me/minkultrb/44848
[187] https://t.me/minkultrb/44798
[188] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15483
[189] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15427
[190] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15428

песень, адзін са стваральнікаў дакументальных фільмаў аб Расійскай гвардыі. Падчас сустрэч курсанты даведаліся пра гісторыю аднаўлення будынка «Галоўнага штаба», яго калекцыі і пра вялікіх гістарычных асоб Расіі. *«Рабяты з вялікай цікавасцю паслухалі афіцэрскія рамансы і палкавыя песні, у якіх з Пятроўскіх часоў вайскоўцы ўслаўляюцца як надзейная апора дзяржавы, захавальнікі ратных традыцый і духоўных чалавечых каштоўнасцяў».* Творчыя сустрэчы арганізаваны пры падтрымцы Рускага Дома ў Мінску[191].

**- святочныя канцэрты, прысвечаныя Дню народнага адзінства Расіі**:

- ***Рускі Дом у Мінску.*** Кіраўнік прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Юрый Макушын у віншавальным выступленні падкрэсліў важнасць кансалідацыі нашых брацкіх народаў перад любымі выклікамі, адзначыўшы вялікі сумесны гістарычны шлях Расіі і Беларусі, які наглядна дэманструе шчырыя, цёплыя і сяброўскія адносіны паміж нашымі краінамі[192].
- ***Каледж мастацтваў імя Сакалоўскага, Гомель.*** Арганізатар — Рускі Дом у Гомелі[193,194].
- ***Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж.*** Канцэрт прайшоў пад назвай «Сімфонія рускай душы». Сярод запрошаных гасцей былі віцэ-консул Генконсульства Расіі ў Гродне Юрый Саломін, кіраўнік Рускага Дома ў Гродне Алена Літвішэнка, кіраўнік Гродзенскага аддзялення РГА «Рускае таварыства» Аляксандр Бірукоў[195,196].
- ***Брэст.*** Прайшла цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў міжнароднага фестывалю школьных тэатральных калектываў «Дзве сястры: Беларусь і Расія»[197].

**- выстава «Народаў шмат — Радзіма адна» напярэдадні Дня народнага адзінства Расіі** *(Рускі Дом у Гомелі).* Быў арганізаваны тэлемост, які аб’яднаў школьнікаў з СШ № 74 г. Гомеля і СШ № 5 г. Сургута. Навучэнцы абмяняліся віншаваннямі, а таксама даведаліся пра гістарычныя падзеі, у гонар якіх 4 лістапада ў Расіі заснавана свята. Прайшоў конкурс малюнкаў «Мы сяброўствам сваім моцныя»[198,199,200].

**- святочны вечар, прысвечаны 30-годдзю «Рускага таварыства»** *(Рускі Дом у Мінску).* Арганізацыя займаецца падтрымкай і прасоўваннем рускай мовы, захаваннем культурных і гістарычных традыцый, а таксама садзейнічае ўмацаванню грамадскіх сувязей Расіі і Беларусі[201].

**- прэзентацыя праекта «Кніга Памяці. Рэспубліка Беларусь. Мінск і Мінская вобласць»** *(Рускі Дом у Мінску).* Гэта цыкл выданняў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які аб’яднаў ваенных гісторыкаў Саюзнай дзяржавы. Асноўным каардынатарам праекта выступае Фонд ветэранаў дыпламатычнай службы[202].

**- Вялікая этнаграфічная дыктоўка** *(Мінск[203], Гродна[204]).* У Мінску пасля тэсціравання вакальны ансамбль «Берагі» выканаў песні ў лепшых традыцыях рускай народнай культуры.

[191] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15383
[192] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15438
[193] https://t.me/russiangomel/5414
[194] https://t.me/russiangomel/5416
[195] https://t.me/russkiydomvgrodno/2320
[196] https://t.me/russkiydomvgrodno/2332
[197] https://t.me/rcnkbrest/25084
[198] https://t.me/russiangomel/5367
[199] https://t.me/russiangomel/5377
[200] https://t.me/russiangomel/5415
[201] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15395
[202] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15323
[203] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15456
[204] https://t.me/russkiydomvgrodno/2322

У завяршэнне мерапрыемства адбылося чаяванне з самаварам, сушкамі і абаранкамі. Арганізатары акцыі ў Беларусі — Федэральнае агенцтва па справах нацыянальнасцей Расіі, прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Цэнтр міжнародных сувязей Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**- цыкл лекцый, прысвечаных рускай класічнай літаратуры** *(Рускі Дом у Мінску).* Ініцыятар — Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Рускае таварыства». Стала вядома, што 14 лістапада кандыдат філалагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр Гарбачоў раскажа гасцям пра любоўную лірыку Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна[205].

**- спецыяльны кінапаказ у рамках XXX Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»** *(Рускі Дом у Мінску).* Здымачная група на чале з рэжысёрам, ганаровым дзеячам мастацтваў горада Масквы Кірылам Палікарпавым прадставіла ваенна-патрыятычныя анімацыйныя фільмы «Прывід» і «Жураўлі»[206,207].

**- паказ фільма RT Documentary «Чаму я пераехаў у Расію?»** *(Рускі Дом у Мінску)*[208].

**- дабрачынная акцыя «Кіно дзецям».** Рускі Дом у Мінску штогод аказвае падтрымку дабрачыннай акцыі «Кіно дзецям», удзельнікамі якой становяцца школьнікі 1-7 класаў з сацыяльна-неабароненых пластоў насельніцтва. Ад Рускага Дома ў Мінску школьнікам была падорана мастацкая літаратура сучасных і класічных расійскіх пісьменнікаў[209].

**- прэм’ерны паказ дакументальнага фільма пра прападобных Еўфрасінню Маскоўскую і Еўфрасінню Полацкую — «Дзве Еўфрасінні: Радасць зямлі Рускай»** *(Мінскі храм-помнік у імя Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню Айчыны нашай паслужылі).* Кінакарціна расказвае аб жыцці і служэнні гэтых дзвюх святых жанчын, *«сімвалічна адлюстроўваючы сувязь двух народаў святой Русі — Беларусі і Расіі».* Мерапрыемства прайшло ў рамках культурнага супрацоўніцтва Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Таксама адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне граматамі Рассупрацоўніцтва. Граматай быў узнагароджаны дэпутат Палаты прадстаўнікоў Чарнецкі за актыўны ўдзел у развіцці культурнага абмену паміж Расіяй і Беларуссю, папулярызацыю агульных маральна-этычных каштоўнасцей, за неаднаразовы ўдзел у здымках фільмаў сумеснай вытворчасці[210].

**- паказ расійскага фільма «Легенды вечных снягоў»** *(кінатэатр «Перамога»).* Паказ быў арганізаваны пры падтрымцы Рускага Дома ў Мінску, у гэты вечар госці прэм’еры змаглі таксама пазнаёміцца з фотавыставай «З гісторыі расійскага кіно»[211].

**- творчыя сустрэчы з расійскімі дзеячамі культуры і мастацтва Аляксандрам Іншаковым і Наталляй Варлей** *(Дом Масквы ў Мінску)*[212].

**- расійска-беларускі музычны праект «Чароўныя гукі арфы»** *(Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь).* Прагучалі сачыненні рускіх кампазітараў Міхаіла Глінкі, Мікалая Рымскага-Корсакава і Сяргея Рахманінава. Гэта сумесны праект прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь[213].

---

[205] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15470
[206] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15390
[207] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15472
[208] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15392
[209] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15405
[210] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15437
[211] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15485
[212] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15337
[213] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15357

**- мастацкая выстава «Ветлужскія Эцюды»** *(Рускі Дом у Гродне).* На адкрыцці прысутнічаў аўтар — ніжагародскі графік, член саюза мастакоў Расіі Аляксей Мяснікоў[214,215,216,217].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 1-10 лістапада 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**З Лошыцкага яра знік крыж ахвярам бальшавіцкага тэрору.**

Лічыцца, што ў гэтым урочышчы ў 1937-1941 гады органы НКУС праводзілі масавыя расстрэлы[218].

***

**З Расіі прыехала выкрываць «міф пра Курапаты» гісторык, якая перапісвае гісторыю Катынскага расстрэлу на карысць чэкістаў.**

У прапагандысцкім рэпартажы на дзяржаўным тэлебачанні гісторык Аксана Карнілава са Смаленска разабрала выдуманую ёю самой канспіралагічную тэорыю пра «пятую Катынь» у Беларусі, за якой быццам бы стаіць Польшча[219].

***

**У Гомелі з’явіцца чарговы «ваенны» мурал.**

На фасадзе жылога дома па праспекце Касманаўтаў размесцяць партрэт Героя Савецкага Саюза Аляксандра Гарбатава — у рамках святкавання 81-й гадавіны вызвалення Гомеля ад нямецкай акупацыі. Пры гэтым Гарбатаў ніяк не звязаны з Гомелем. Гэта расіянін, які пачынаў службу яшчэ ў імператарскай арміі ў 1912 годзе[220].

---

[214] https://t.me/russkiydomvgrodno/2293
[215] https://t.me/russkiydomvgrodno/2304
[216] https://t.me/russkiydomvgrodno/2307
[217] https://t.me/russkiydomvgrodno/2321
[218] https://nashaniva.com/354585
[219] https://nashaniva.com/354535
[220] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/gorad/v-gomele-pojavitsja-ocherednoj-voennyj-mural-v-chest-repressirovannogo-komandira-kotoryj-podvergalsja-pytkam-nkvd.html

***

**У Мінскім гарадскім судзе вынеслі першы прысуд у Беларусі за «адмаўленне генацыду беларускага народу» (ч. 1 арт. 130-2 КК).**

55-гадовага тынкара з Мінскага раёна Андрэя Савіцкага асудзілі на 3 гады калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму, абвінаваціўшы яшчэ ў «абразе» Лукашэнкі (ч. 1 арт. 368 КК). Падставай для пераследу сталі пасты ў «Аднакласніках» пра Хатынь і Лукашэнку[221,222].

***

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі павіншавала падпісчыкаў свайго тэлеграм-канала з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі вершам рускага паэта Сяргея Ясеніна.**

*«Гэтае свята — даніна павагі да гістарычных падзей мінулых дзён, памяці і традыцый папярэдніх пакаленняў»,* — гаворыцца ў віншаванні[223]. А работнікі бібліятэкі наведалі мітынг, прысвечаны 107 гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі[224].

***

**У Мінску прайшоў кірмаш «Зроблена ў Тульскай вобласці».**

Жыхарам сталіцы Беларусі былі прадстаўлены тульскія пернікі, бялёўская пасціла, жаравыя і камбінаваныя самавары, вырабы народных мастацкіх промыслаў, адзенне і аксесуары, бытавая хімія і касметыка, а таксама развіваючыя гульні для дзяцей[225].

***

**На Мінскі Міжнародны фестываль «Лістапад» прыехаў цэлы россып расійскіх кінематаграфістаў.**

У Доме Масквы адбыўся творчы вечар заслужанай артысткі РСФСР Наталлі Варлей. Прайшлі пазаконкурсныя паказы фільмаў грамадскіх дзеячаў, кінематаграфістаў Мікалая Бурляева і Карэна Шахназарава. На кінастудыі «Беларусьфільм» была сустрэча з рэжысёркай стужак пра гардэмарынаў Святланай Дружынінай[226].

***

**Дырэктар «Масфільма» лічыць, што кінематаграфісты Беларусі павінны мець магчымасць фінансавання ў Расіі.**

Беларускія кінематаграфісты павінны атрымліваць магчымасць фінансавання сваіх праектаў у расійскім Фондзе кіно і Міністэрстве культуры РФ. Такім меркаваннем

[221] https://t.me/viasna96/28415
[222] https://www.svaboda.org/a/33188605.html
[223] https://t.me/libraryofbel/5318
[224] https://t.me/libraryofbel/5320
[225] https://t.me/RusEmbassyMinsk/5532
[226] https://reformby.org/back-in-ussr-na-festyvali-listapad-prajshli-sustrjechy-z-svjatlanaj-druzhyninaj-karjenam-shahnazaravym-mikalaem-burljaevym

падзяліўся расійскі рэжысёр, генеральны дырэктар «Масфільма» Карэн Шахназараў падчас прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да адкрыцця Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»[227].

***

**«Беларусьфільм» прыйшоў да пагаднення аб сумеснай кінавытворчасці з «Ленфільмам».**

Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Аляксей падчас Дня адчыненых дзвярэй[228].

***

**Мінскі «Кінавідэапракат» і «Таджыкфільм» падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве.**

*«Мы будзем часцей паказваць свае фільмы беларускім гледачам, а беларускія фільмы будуць часцей з'яўляцца ў Таджыкістане. Гэта стане пачаткам добрай традыцыі»,* — сказаў дырэктар дзяржаўнай установы «Таджыкфільм» Махмадсаід Шохіен[229].

***

**Кітайскія кінематаграфісты хочуць развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю.**

Рэжысёр фільма «Бясконцае падарожжа» Дао Мо падчас Дня кітайскага кіно ў Мінску адзначыў, што зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Беларуссю[230].

***

**На «Лістападзе» адбыўся Дзень індыйскага кіно.**

У кінатэатры «Перамога» адбыўся Дзень кіно Індыі. Прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, госці і ўдзельнікі фестывалю гаварылі аб важнасці культурнага і кінематаграфічнага супрацоўніцтва дзвюх краін[231,232,233].

***

**На кінафестывалі «Лістапад» прайшоў Дзень кіно Узбекістана.**

У сваёй прывітальнай прамове Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула Назараў адзначыў: *«Калі гаварыць аб двухбаковых*

---

[227] https://belta.by/culture/view/direktor-mosfilma-kinematografisty-belarusi-dolzhny-imet-vozmozhnost-finansirovanija-v-rossii-672629-2024/
[228] https://belta.by/culture/view/direktor-belarusfilma-my-prishli-k-soglasheniju-o-sovmestnom-kinoproizvodstve-s-lenfilmom-673193-2024/
[229] https://t.me/sbbytoday/133154
[230] https://reformby.org/pazdymac-na-fone-velmi-prygozhyh-pejzazha-kitajskija-kinematagrafisty-hochuc-razvivac-supraco-nictva-z-belarussju
[231] https://www.sb.by/articles/na-listapadze-sostoyalsya-den-indiyskogo-kino-.html
[232] https://belta.by/society/view/posol-indii-u-nashih-stran-ochen-moschnoe-sotrudnichestvo-v-oblasti-kinematografii-672871-2024/
[233] https://t.me/minkultrb/44489

*адносінах Беларусі і Узбекістана, узаемадзеянне нашых краін развіваецца надзвычай дынамічна, асабліва ў апошнія некалькі гадоў»*[234].

***

**Дзень якуцкага кіно прайшоў у кінатэатры «Перамога».**

На мерапрыемстве прадставілі фільм «Легенды вечных сноў» Аляксея Раманава. *«Упэўнены, што наша супрацоўніцтва ў сферы культуры будзе актыўна развівацца і прымнажацца»,* — адзначыў намеснік міністра культуры Беларусі Сяргей Саракач[235].

***

**Прарасійскія актывісты разам з Вольгай Бондаравай зноў пачалі абурацца беларускай мовай у горадзе.**

Іх скаргаў пра «дэрусіфікацыю» на гэты раз не вытрымаў прапагандыст Рыгор Азаронак. Праўда, ён не столькі рашыў абараніць беларускую мову, колькі *«не даць унесці раскол у Саюзную дзяржаву».* Бондарава і яе паплечнікі ў адказ пачалі наперабой публікаваць шыльды з беларускай мовай на вуліцах, каб даказаць, што рускую мову «ўшчамляюць». *«На сённяшні дзень мы бачым агідныя вычварэнствы рускамоўных слоў у назвах геаграфічных аб'ектаў: вул. Вызваления, Мазыр Павночный, вул. Костричницкая і г. д. Да чаго гэта? Мы расцэньваем гэта як яшчэ адзін крок да дэрусіфікацыі: у наяўнасці спробаў поўнага адыходу ад нармальнай рускай мовы ў назвах геаграфічных аб'ектаў у краіне, дзе раўнапраўны статус абедзвюх дзяржаўных моў замацаваны заканадаўча — у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь»,* — заявіла Бондарава[236].

***

**У «экстрэмісцкі» спіс дадалі лагатып Telegram-каналу «Šufliadka» — літару «Š» з беларускага лацінскага алфавіту Мінінфарм назваў «польскай».**

Міністэрства інфармацыі абнавіла Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Сярод іншых, у яго дадалі Telegram-канал «Šufliadka» — адпаведнае рашэнне прынятае судом Ленінскага раёна Гродна 4 лістапада. Таксама «экстрэмісцкім» прызнаны лагатып каналу — *«графічная выява белага колеру на чорным фоне ў выглядзе шуфлядкі, верхняя вечка якой намаляваная ў форме, падобнай з літарай "Š" з польскага алфавіту».* Адзначым, што ў польскім алфавіце няма літары «Š» — яна ёсць у шэрагу славянскіх моў, у тым ліку ў лацінскім варыянце беларускага алфавіту. Да нядаўняга часу, лацінскі варыянт транслітэрацыі з літарай «Š» сустракаўся ў грамадскіх месцах па ўсёй Беларусі[237].

***

**У Гомелі з'явіліся афішы гастроляў драматычнага тэатра з ЛНР.**

---

[234] https://sb-by.turbopages.org/sb.by/s/articles/na-yubileynom-xxx-minskom-mezhdunarodnom-kinofestivale-proshel-den-kino-uzbekistana-i-pokaz-filma-uz.html
[235] https://belta-by.turbopages.org/belta.by/s/culture/view/den-jakutskogo-kino-proshel-v-kinoteatre-pobeda-673962-2024/
[236] https://nashaniva.com/355037
[237] https://t.me/viasna96/28434

У Гомелі з’явіліся афішы гастроляў Луганскага акадэмічнага музычна-драматычнага тэатра імя М. Галубовіча. Спектакль пад назвай «Апошняе каханне Дзеда Мароза» пакажуць у Гомельскім абласным драматычным тэатры. Цікава, што трупа акцёраў з акупаванага Расіяй рэгіёна палічыла патрэбным паказаць свае ўкраінскія рэгаліі[238].

***

**Трох самых зорных акцёраў РТБД звольнілі з тэатра.**

Акцёраў РТБД Максіма Брагінца, Змітра Давідовіча і Арцёма Курэня, якіх раней затрымлівалі на суткі, звольнілі з тэатра. На гэтым трыа трымалася значная частка самых касавых, папулярных у гледачоў спектакляў, таму ў тэатры працягваюцца вымушаныя замены ў рэпертуары. Нагадаем, пра затрыманне акцёраў РТБД стала вядома 19 кастрычніка. Іх асудзілі па артыкуле 19.1 КаАП (дробнае хуліганства) на суткі. Акрамя Давідовіча, Курэня і Брагінца, затрымлівалі таксама яшчэ адну актрысу, але пазней адпусцілі да дзіцяці. Пад рэпрэсіі трапіла і былая кіраўніца тэатра[239,240]. Неўзабаве з калектыву сышла яшчэ адна з яго лідарак — акторка Ганна Семяняка. Дакладная прычына звальнення актрысы невядомая[241].

***

**Арыштаваны спявак Дзядзя Ваня.**

44-гадовага шоўмэна Івана Вабішчэвіча затрымалі яшчэ ў верасні 2024 года. Хутчэй за ўсё, прычынай гэта палітыка. У сілавікоў і раней узнікалі пытанні да яго, але гэтыя прэтэнзіі нібыта ўдалося ўрэгуляваць і Дзядзя Ваня працягнуў музычную дзейнасць[242,243].

[238] https://reformby.org/v-gomele-pojavilis-afishi-gastrolej-dramaticheskogo-teatra-iz-lnr
[239] https://t.me/viasna96/28360
[240] https://nashaniva.com/354496
[241] https://nashaniva.com/354748
[242] https://t.me/viasna96/28413
[243] https://nashaniva.com/354752

**На міжнародным форуме ў Мінску абмяркоўвалі Дэградацыю еўрапейскай культуры, начальнік аддзела падрыхтоўкі выступленняў Адміністрацыі Лукашэнкі Радзіна-Карачэўская прааналізавала ўплыў «міфа аб Каліноўскім» на палітычную сітуацыю ў краіне ў розныя перыяды, Міністэрства інфармацыі запатрабавала зняць з продажу выданні, якія «наносяць шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі», школьнікаў у Гомельскай вобласці водзяць па разнарадцы на новы мультфільм, у якім «культ замежнай нячыстай сілы» замяняюць айчынным, Купалаўскі тэатр рыхтуе прэм’еру «Дзядзечкаў сон» паводле Дастаеўскага ў пастаноўцы расійскага рэжысёра, з РТБД сышоў чарговы акцёр, пластычны тэатр «ІнЖэст» страціў памяшканне для рэпетыцый — навіны культуры за перыяд 11-20 лістапада 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 11-20 лістапада 2024 года на афіцыйным сайце[244] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 5 навін, якія былі прысвечаны: перспектывам супрацоўніцтва ўстаноў культуры і мастацтва Амурскай вобласці Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь[245], новаму этапу акцыі «Разам з мастацтвам»[246], дыялогавай пляцоўцы з удзельнікамі творчай стажыроўкі беларусаў замежжа[247], Трэцім адкрытым моладзевым Арктычным Дэльфійскім гульням, якія пройдуць у г. Сыктыўкар (Расія)[248], пасяджэнню калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь[249]. Афіцыйны тэлеграм-канал[250] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 130 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 107 |
| Беларуская | 18 |
| Абедзве | 5 |

[244] https://www.kultura.by/

[245] https://www.kultura.by/news/u-natsyyanalnym-gistarychnym-muzei-prakhodzits-krugly-stol-prysvechany-perspektyvam-supratso-nitstva/
[246] https://www.kultura.by/news/segodnya-v-chausskom-rayonnom-dome-kultury-prodolzhilos-provedenie-novogo-etapa-aktsii-razam-z-masta/
[247] https://www.kultura.by/news/ministr-kultury-anatoliy-markevich-i-upolnomochennyy-po-delam-religiy-i-natsionalnostey-aleksandr-ru/
[248] https://www.kultura.by/news/s-22-po-26-noyabrya-2024-goda-delegatsiya-respubliki-belarus-vpervye-primet-uchastie-v-tretikh-otkry/
[249] https://www.kultura.by/news/o-rabote-rup-natsionalnaya-kinostudiya-belarusfilm-v-2024-godu-i-perspektivakh-razvitiya-belorusskog/
[250] https://t.me/MinobrofBelarus

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 13 навін;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 10 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 32 навіны.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***

- правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Вэньчуань. На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, дасягнута дамоўленасць аб правядзенні Дзён культуры Кітая ў Беларусі ў снежні бягучага года[251].

- разам з упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей Аляксандрам Румаком правёў дыялогавую пляцоўку з удзельнікамі творчай стажыроўкі беларусаў замежжа (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы)[252,253].

- правёў пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, прысвечанае рабоце РУП «Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”» і перспектывам развіцця беларускага кінематографа ў цэлым[254].

***Першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада:***

- прыняў удзел у круглым стале, прысвечаным перспектывам супрацоўніцтва ўстаноў культуры і мастацтва Амурскай вобласці Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь (Нацыянальны гістарычны музей)[255].

- прыняў удзел у круглым стале «Роўныя магчымасці — роўныя правы» ў рамках мерапрыемства Саюзнай дзяржавы «Фестываль творчасці інвалідаў “Разам мы зможам больш”»[256].

- выступіў з прывітальным словам на адкрыцці XXXV Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску[257].

***Начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга:***

---

[251] https://t.me/minkultrb/45084
[252] https://t.me/minkultrb/45149
[253] https://t.me/minkultrb/45151
[254] https://t.me/minkultrb/45353
[255] https://t.me/minkultrb/44946
[256] https://t.me/minkultrb/45098
[257] https://t.me/minkultrb/45460

- правяла адзіны дзень інфармавання з журналістамі РВУ «Культура і мастацтва». Ключавой у абмеркаванні стала тэма «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: будучыня залежыць ад нас»[258].

***Начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Вікторыя Ратабыльская:***

- прыняла ўдзел у пасяджэнні «Аб прыярытэтных напрамках работы ў сферы культуры г. Баранавічы», якое адбылося ў Баранавіцкім гарадскім выканаўчым камітэце[259].

***Начальнік упраўлення прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Вадзім Зайцаў:***

- правёў «прамую тэлефонную лінію» па пытаннях прафесійнага мастацтва[260].

***Начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Марына Юркевіч:***

- правяла Адзіны Дзень інфармавання ў Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя Глебава па тэме: «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: Будучыня залежыць ад нас»[261].

***Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Кацярына Усава:***

- прыняла ўдзел у Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» ў Бабруйску[262].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- у галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя выдання «Сыны Башкартастана ў баях за Беларусь», прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і да 80-годдзя Вялікай Перамогі. Кніга падрыхтавана выдавецтвамі «Беларусь» і «Кітап» (Башкартастан) на матэрыяле архіўных і музейных устаноў дзвюх краін[263].

- у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося адкрыццё выставы «Гэта было ў Мінскім гета»[264].

---

[258] https://t.me/minkultrb/45217
[259] https://t.me/minkultrb/44989
[260] https://t.me/minkultrb/45216
[261] https://t.me/minkultrb/45447
[262] https://t.me/minkultrb/45239
[263] https://t.me/minkultrb/44991
[264] https://t.me/minkultrb/45200

- у Прэс-цэнтры Дома прэсы адбылася прэс-канферэнцыя «Захаванне гістарычнай памяці. Флагманскія праекты да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне». Сярод праектаў — стварэнне помнікаў, выстаў і адукацыйных праграм, арыентаваных на маладое пакаленне[265,266].

- у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў стартаваў I Рэспубліканскі конкурс чытальнікаў, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Вялікай Перамогі. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў[267].

- стала вядома, што ў рамках Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» ў Магілёве будзе працаваць тэматычная выстава «Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 — ліпень 1944 гг.»[268].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 32 навіны, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 24 навіны;

Кітай — 3 навіны;

Сербія — 2 навіны;

Казахстан — 1 навіна;

Індыя — 1 навіна;

Таджыкістан — 1 навіна.

***Расія:***

- у Нацыянальным гістарычным музеі прайшоў круглы стол, прысвечаны перспектывам супрацоўніцтва ўстаноў культуры і мастацтва Амурскай вобласці Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Адбылося падпісанне шэрагу пагадненняў між установамі культуры Беларусі і Амурскай вобласці[269]. Быў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве з Амурскай абласной філармоніяй[270].

[265] https://t.me/minkultrb/45380
[266] https://t.me/minkultrb/45453
[267] https://t.me/minkultrb/45425
[268] https://t.me/minkultrb/45475
[269] https://t.me/minkultrb/44946
[270] https://t.me/minkultrb/44974

- прайшло мерапрыемства Саюзнай дзяржавы «Фестываль творчасці інвалідаў “Разам мы зможам больш”». Фестываль накіраваны ў тым ліку на захаванне агульнай культурнай прасторы[271,272,273,274,275,276,277,278,279,280,281,282].

- у Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя Масленікава адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы «На варце Айчыны: крамлі і крэпасці» фотамастака Костаса Амісіса. Фотаработы адлюстроўваюць моц і прыгажосць старажытных гарадоў і крэпасцяў — Ноўгарада, Пскова, Растова Вялікага, Казані, а таксама беларускага Брэста. Праект рэалізуецца ў рамках Мемарандума аб супрацоўніцтве Бранскага абласнога мастацкага музейна-выставачнага цэнтра і Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. В. Масленікава[283,284].

- пасол Беларусі ўручыў народнай артыстцы СССР Аляксандры Пахмутавай ордэн Дружбы народаў. Аляксандра Пахмутава ўдастоена гэтай узнагароды ўказам Аляксандра Лукашэнкі за значны ўклад у развіццё музычнага мастацтва, умацаванне міру, беларуска-расійскіх адносін і культурных сувязей, плённую творчую дзейнасць, якая садзейнічае збліжэнню і ўзаемаўзбагачэнню нацыянальных культур[285].

- У рамках дагавора аб супрацоўніцтве дэлегацыя экскурсаводаў і навуковых супрацоўнікаў музея-запаведніка «Нясвіж» наведала Маскоўскі дзяржаўны аб’яднаны мастацкі гісторыка-архітэктурны і прыродна-ландшафтны музей-запаведнік[286].

- стала вядома, што 10 снежня калектыў расійскага тэатра «Волга Опера» (110 чалавек) упершыню выступіць на беларускай сцэне ў Вялікім тэатры Беларусі з космаоперай «Галоўнае пытанне» кампазітара Рустама Сагдзіева[287], а 11 снежня Варонежскі тэатр оперы і балета прадставіць на Мінскім міжнародным Калядным оперным форуме спектакль «Вяселле Фігара» В. Моцарта[288].

- стала вядома, што з 22 па 26 лістапада дэлегацыя Рэспублікі Беларусь упершыню прыме ўдзел у Трэціх адкрытых моладзевых Арктычных Дэльфійскіх гульнях, якія пройдуць у г. Сыктыўкар (Рэспубліка Комі, Расійская Федэрацыя)[289].

***Кітай:***

- Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі наведала дэлегацыя Гуансійскага педагагічнага ўніверсітэта навукі і тэхналогій (г. Лайбін, Кітайская Народная Рэспубліка). Удзельнікі сустрэчы закранулі шырокі спектр пытанняў, якія датычацца адукацыйных, творчых і

[271] https://t.me/minkultrb/44973
[272] https://t.me/minkultrb/44999
[273] https://t.me/minkultrb/45026
[274] https://t.me/minkultrb/45042
[275] https://t.me/minkultrb/45098
[276] https://t.me/minkultrb/45125
[277] https://t.me/minkultrb/45168
[278] https://t.me/minkultrb/45178
[279] https://t.me/minkultrb/45227
[280] https://t.me/minkultrb/45241
[281] https://t.me/minkultrb/45243
[282] https://t.me/minkultrb/45252
[283] https://t.me/minkultrb/44981
[284] https://t.me/minkultrb/45158
[285] https://t.me/minkultrb/44996
[286] https://t.me/minkultrb/45144
[287] https://t.me/minkultrb/45237
[288] https://t.me/minkultrb/45297
[289] https://t.me/minkultrb/45328

навуковых праектаў у сферы музычнага мастацтва, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. У выніку перагавораў была падпісана дамова аб двухбаковым супрацоўніцтве[290].

- стала вядома, што ў сярэдзіне снежня музыканты Вялікага тэатра Беларусі (усяго 68 чалавек) адправяцца ў гастрольны тур па Кітаю. Наш Сімфанічны аркестр прадставіць канцэрты на 12-ці пляцоўках: у Наньчане, Шанхаі, Чаншы, Цюйсжоу, Яньтаі, Лішуі, Шэньяне, Харбіне, Ляояне, Даляне, Цзінане, Ухане[291].

***Сербія:***

- у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася выстава жывапісу сербскай манашкі Марыі «Святыя Навамучанікі Ясенавецкія ў святле Уваскрэсення». З прывітальным словам на цырымоніі адкрыцця выступілі дырэктар музея В. Варапаеў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліна Вукайловіч, намеснік Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Ю. Амбразевіч, дырэктар Музея ахвяр генацыду ў Бялградзе Б. Арбуцін. Паміж Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Музеем ахвяр генацыду ў Бялградзе было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў 2025 годзе[292,293].

***Казахстан:***

- у рамках рабочага візіту ў Рэспубліку Беларусь Прэм’ер-міністра Рэспублікі Казахстан быў падпісаны «План мерапрыемстваў аб узаемадзеянні ў сферы культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Казахстан на 2025-2026 гг.»[294].

***Індыя:***

- стала вядома, што Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» упершыню прыме ўдзел у Міжнародным індыйскім кінафестывалі. Усяго будзе прадстаўлена 180 стужак з 81 краіны. Беларуская карціна «Чорны замак» адкрые секцыю міжнароднай праграмы 22 лістапада[295].

***Таджыкістан:***

- стала вядома, што ў рамках Дзён культуры Беларусі ў Таджыкістане з с 23 па 28 лістапада Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча пакажа беларускія народныя песні «Туман ярам», «Касіў Ясь Канюшыну», «Ой, ляцелі гусі з броду» і інш[296].

**На што яшчэ варта звярнуць увагу:**

[290] https://t.me/minkultrb/45406
[291] https://t.me/minkultrb/45496
[292] https://t.me/minkultrb/44964
[293] https://t.me/minkultrb/45310
[294] https://t.me/minkultrb/45157
[295] https://t.me/minkultrb/45363
[296] https://t.me/minkultrb/45391

- шырокае асвятленне (16 навін) Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства». 15-16 лістапада мерапрыемства прайшло ў Бабруйску[297,298,299,300,301,302]. У межах акцыі адкрыўся мабільны музей «Наш абавязак — памятаць!»[303,304], для супрацоўнікаў ААТ «Бабруйскі завод буйнапанэльнага домабудавання» прайшоў канцэрт прама ў вытворчым цэху[305], у кінатэатрах КУП «Бабруйсккіно» прайшлі кінапаказы фільмаў вытворчасці «Беларусьфільм» з удзелам прадстаўнікоў кінастудыі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь[306].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову, перадаюць установам адукацыі і культуры камплекты кніг.

У перыяд з 11 па 20 лістапада 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі дадатковай адукацыйнай праграмы «Руская мова як аснова сацыякультурнага праектавання ў сучаснай адукацыйнай прасторы»** *(Мінск)*. Мэтай з’яўляецца падтрымка ролі рускай мовы як адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь праз распрацоўку спосабаў сацыякультурнага праектавання пры яе выкарыстанні ў адукацыйным працэсе. На працягу двух дзён на сямі пляцоўках былі арганізаваны канферэнцыі, адкрытыя лекцыі, майстар-класы, круглыя сталы, семінары, дыскусійныя пляцоўкі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 300 чалавек, сярод якіх выкладчыкі рускай мовы і літаратуры, вучоныя-даследчыкі, бібліятэкары, прадстаўнікі грамадскіх аб’яднанняў, супрацоўнікі ўстаноў культуры, метадысты, студэнты-філолагі. Комплекс мерапрыемстваў праводзіцца Фондам падтрымкі гуманітарных навук «Мая гісторыя» сумесна з Тульскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам ім. Л. М. Талстога, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам і Мінскім дзяржаўным інстытутам развіцця адукацыі пры падтрымцы Міністэрства асветы РФ і прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь[307,308]. Кіраўнік прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Юрый Макушын адзначыў, што і ў Расійскай Федэрацыі, і ў Рэспубліцы Беларусь удзяляецца вялікая ўвага пытанням развіцця і пашырэння выкарыстання рускай мовы ў розных сферах, у першую чаргу, у адукацыі і выхаванні моладзі, а такія сумесныя мерапрыемствы садзейнічаюць яшчэ больш цеснаму згуртоўванню нашых брацкіх краін у дасягненні агульных мэт[309].

---

297 https://t.me/minkultrb/44990
298 https://t.me/minkultrb/45205
299 https://t.me/minkultrb/45206
300 https://t.me/minkultrb/45207
301 https://t.me/minkultrb/45220
302 https://t.me/minkultrb/45240
303 https://t.me/minkultrb/45215
304 https://t.me/minkultrb/45322
305 https://t.me/minkultrb/45238
306 https://t.me/minkultrb/45344
307 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15532
308 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15572
309 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15537

**- падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.** У афіцыйным паведамленні гаворыцца: *«Сумесна мы правялі мноства знакавых культурна-асветніцкіх і навукова-пазнавальных мерапрыемстваў, таксама дзякуючы нашым намаганням упершыню ў Беларусі прайшлі Міжнародны форум "Гісторыя для будучыні. Расія і Беларусь" і фестываль-лекторый "Лічбавая гісторыя". Упэўнены, што падпісанае пагадненне дасць магчымасць нам і ў далейшым пасяхова рэалізоўваць яркія і актуальныя праекты на карысць нашых брацкіх краін і развіцця Саюзнай дзяржавы»*[310].

**- цыкл лекцый, прысвечаных рускай класічнай літаратуры** *(Рускі Дом у Мінску).* Ініцыятар — Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Рускае таварыства». На першай сустрэчы кандыдат філалагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр Гарбачоў расказаў гасцям пра любоўную лірыку Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна[311].

**- новы праект Рускага Дома ў Брэсце «Літаратурнае кафэ».** У гастрабары «Пушкін» прайшла паэтычная вечарына, прысвечаная творам рускіх паэтаў[312].

**- творчая сустрэча з пецярбургскімі пісьменніцамі Арынай Абух і Святланай Волкавай** *(Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Гродне).* Гэты візіт быў падрыхтаваны Рускім Домам у Гродне сумесна з Асацыяцыяй саюзаў пісьменнікаў і выдаўцоў Расіі[313].

**- Асацыяцыя саюзаў пісьменнікаў і выдаўцоў Расіі перадала Рускаму Дому ў Гродне больш за 500 выданняў класічнай і сучаснай рускай літаратуры.** У далейшым гэтыя выданні папоўняць бібліятэчныя фонды Беларусі. Апроч кніг, бібліятэцы Рускага Дома перадалі 58 выпускаў літаратурных часопісаў[314].

**- сустрэча ў рамках праекта «Культурны код народаў Расіі і Беларусі», прысвечаная беларускаму і рускаму дэкаратыўна-прыкладному мастацтву** *(клуб «Берагіня», Брэст)*[315].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 11-20 лістапада 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

[310] https://t.me/naukaicultutaRossiivBelarusi/15552
[311] https://t.me/naukaicultutaRossiivBelarusi/15531
[312] https://t.me/rcnkbrest/25308
[313] https://t.me/russkiydomvgrodno/2393
[314] https://t.me/russkiydomvgrodno/2411
[315] https://t.me/rcnkbrest/25255

**На міжнародным форуме ў Мінску абмяркоўвалі Дэградацыю еўрапейскай культуры.**

Праблему дэградацыі культуры ў Еўропе абмеркавалі ў Мінску на міжнародным форуме, арганізатарам якога выступіў фонд Эміля Чачко. Дыскутавалі эксперты і журналісты з розных краін[316].

***

**Начальнік аддзела падрыхтоўкі выступленняў Адміністрацыі Лукашэнкі Радзіна-Карачэўская прааналізавала ўплыў «міфа аб Каліноўскім» на палітычную сітуацыю ў краіне ў розныя перыяды.**

Яна прыйшла да высновы, што *«стварэнне сімвала барацьбы з сістэмай — небяспечная стратэгія... Створаны савецкай прапагандай Каліноўскі ўвасабляў сімвал барацьбы з царскім рэжымам, а ў 1990-я г. стаў сімвалам дыскрэдытацыі адзінства савецкіх народаў. Сёння гэтае імя стаіць у авангардзе інфармацыйных ідэалагічных дыверсій, накіраваных на падрыў канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь»*[317].

***

**Міністэрства інфармацыі запатрабавала зняць з продажу выданні, якія «наносяць шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі».**

Міністэрства інфармацыі Беларусі запатрабавала ад распаўсюднікаў друкаваных выданняў *«самастойна»* правесці рэвізію і зняць з продажу кнігі, якія могуць нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі. Як адзначаецца на афіцыйным сайце ведамства, міністэрства *«ў межах паўнамоцтваў»* пастаянна займаецца выяўленнем «дэструктыўнай» літаратуры, якая ўплывае *«на духоўна-маральную сферу як важны складнік нацыянальнай бяспекі»* і не дае яе распаўсюджваць. Паводле ведамства, кнігарні, вялікія гандлёвыя цэнтры і інтэрнэт-крамы ўсё яшчэ прадаюць выданні, якія нібыта *«скажаюць гістарычную праўду і справядлівасць, прапагандуюць нетрадыцыйныя сэксуальныя дачыненні, рэлігійную нецярпімасць, гвалт, жорсткасць, папулярызуюць нетрадыцыйныя для беларускага грамадства субкультуры, а таксама выданні аб палавым выхаванні дзяцей, здольныя негатыўна паўплываць на іх фізічнае і псіхічнае развіццё і сказіць уяўленні аб сапраўдных сямейных каштоўнасцях»*[318].

***

**Школьнікаў у Гомельскай вобласці водзяць па разнарадцы на новы мультфільм, у якім «культ замежнай нячыстай сілы» замяняюць айчынным.**

Рэгіянальныя філіялы дзяржпрадпрыемства «Гомелькінавідэапракат» разаслалі ў навучальныя ўстановы лісты з просьбай *«аказаць садзейнічанне ў максімальным наведванні кінасеансаў»* новага беларускага анімацыйнага фільма «Песня Сірын». Просьбу абгрунтоўваюць *«вялікім значэннем фільма ў працы з падрастаючым пакаленнем»* і тым, што ён *«нацэлены на знаёмства школьнікаў і моладзі з нацыянальнымі традыцыямі і*

[316] https://ctv.by/news/obshestvo/degradaciyu-evropejskij-kultury-obsuzhdali-na-mezhdunarodnom-forume-v-minske
[317] https://t.me/Gigin_Vadim/2625
[318] https://www.svaboda.org/a/33200264.html

*культурай у процівагу псеўдасвятам, якія маюць у сваёй аснове замежныя культы нячыстай сілы (Хэлоўін)»*[319].

***

**Купалаўскі тэатр рыхтуе прэм’еру «Дзядзечкаў сон» паводле Дастаеўскага ў пастаноўцы расійскага рэжысёра.**

У Тэатры Янкі Купалы расійскі рэжысёр Дзмітрый Акімаў ставіць трагікамедыю «Дзядзечкаў сон» паводле аповесці Фёдара Дастаеўскага. *«Першая прэм’ера ў новым тэатральным сезоне»,* як адзначае тэатр, адбудзецца ў канцы лістапада[320,321].

***

**З РТБД сышоў чарговы акцёр — Дзяніс Аўхарэнка.**

Да ліку раней звольненых зорак калектыву Максіма Брагінца, Зміцера Давідовіча, Арцёма Курэня і Ганны Семяняка далучыўся Дзяніс Аўхарэнка: 14 лістапада ён адыграў свой апошні спектакль у РТБД. Дзяніс таксама быў часткай самых касавых спектакляў — «Шлюб з ветрам», «Забалоцце», «Пачупкі», а таксама выконваў ролю ў папулярнай пастаноўцы па матывах твораў Уладзіміра Караткевіча «Карней». Усе гэтыя спектаклі аднаўляць не плануюць. *«Абстаноўка ў тэатры напружаная, многія баяцца нават паміж сабой стэлефаноўвацца. Тым больш мелі месца даносы. А калі акцёраў затрымалі, увогуле была такая атмасфера, нібыта нехта памёр»,* — расказала выданню «Наша Ніва» абазнаная крыніца. Многія лічаць, што ўсё гэта — дадатковыя запужванні напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў[322].

***

**Пластычны тэатр «ІнЖэст» страціў памяшканне для рэпетыцый.**

Тэатр не меў магчымасці выступаць у Беларусі з восені 2021 года, а цяпер згубіў і месца для рэпетыцый. Пра гэта ў сваім фэйсбуку паведаміў кіраўнік тэатра Вячаслаў Іназемцаў. *«Дзякуючы пільнаму МНС»,* — удакладніў ён. Альтэрнатыўная пляцоўка ў «ІнЖэста» на дадзены момант адсутнічае. Вясной 2021 года «ІнЖэст» адсвяткаваў свой юбілей — 40 год творчай дзейнасці, а ўжо восенню згубіў магчымасць выступаць. Тады ж у Мінску апошні раз прайшоў Фестываль пластычных і танцавальных тэатраў «Пластформа». Тэатр працягваў выконваць адукацыйную функцыю ўвесь гэты час: пры ім дзейнічала студыя, дзе можна было асвоіць псіхафізічны трэнінг пластычнага акцёра «Танцы Звяроў» (па арыгінальнай методыцы Іназемцава), танец бута і шмат іншых накірункаў у фізічным тэатры[323].

---

[319] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/naviny/kult-inostrannoj-nechistoj-sily-zamenjajut-otechestvennym-shkolnikov-v-gomelskoj-oblasti-vodjat-po-raznarjadke-na-novyj-multfilm.html
[320] https://reformby.org/aficyjny-kupala-ski-anansue-prjem-eru-dzjadzechka-son-pavodle-dastae-skaga-pastano-cy-rasijskaga-rjezhysjora
[321] https://t.me/minkultrb/45064
[322] https://nashaniva.com/355400
[323] https://nashaniva.com/355701

**Згодна з дакументамі, падрыхтаванымі Расійскім інстытутам стратэгічных даследаванняў, расійскія чыноўнікі намагаюцца перапісаць гісторыю Беларусі ў сваіх інтарэсах, дэпутата Ігара Марзалюка раздражняе мантра «у нас единая история, у нас единый язык», у Мінскай гарадской ратушы адкрылася выстава «Саюзная крэпасць», Інстытут «Палітычная сфера» прэзентаваў даследаванне «Помнікі Мінска і абласцей: ці адпавядаюць яны нацыянальнай гісторыі і што кажуць пра ўзровень русіфікацыі?», мінскія ўлады прадпісваюць упрыгожваць навагоднія вітрыны толькі «элементамі славянскага паходжання» і забараняюць уключаць у гандлёвых цэнтрах і кавярнях сусветныя навагоднія хіты, Міністэрства інфармацыі склала спіс з 35 кніг, якія наносяць «шкоду нацыянальным інтарэсам нашай краіны», вядомага краязнаўцу з Веткаўскага музея Аляксандра Нікіціна асудзілі ў Гомелі, у Купалаўскім тэатры адбылася першая прэм'ера сезона — трагікамедыя Дастаеўскага з Няфёдавай у галоўнай ролі ў пастаноўцы расійскага рэжысёра — навіны культуры за перыяд 21-30 лістапада 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 21-30 лістапада 2024 года на афіцыйным сайце[324] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 5 навін, якія былі прысвечаны: сустрэчы Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатоля Маркевіча з калектывам Вялікага тэатра Беларусі (асноўнай тэмай сустрэчы сталі выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь)[325]; урачыстай сустрэчы ў дзень праваслаўнага свята абраза Божай Маці «Скорапаслушніца» ў Нацыянальным мастацкім музеі (ў цэнтры ўвагі — пытанні супрацоўніцтва Міністэрства культуры і Беларускай праваслаўнай царквы)[326]; выбарам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[327]; Дням культуры Рэспублікі Беларусь у Таджыкістане[328]; пасяджэнню калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на базе Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне[329]. Афіцыйны тэлеграм-канал[330] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 157 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 136 |

[324] https://www.kultura.by/

[325] https://www.kultura.by/news/budushchee-zavisit-ot-nas/
[326] https://www.kultura.by/news/22-listapadu-odbylasya-rachystaya-sustrecha-dzen-pravasla-naga-svyata-abraza-bozhay-matsi-skorapaslu/
[327] https://www.kultura.by/news/vybory-prezidenta-respubliki-belarus/
[328] https://www.kultura.by/news/s-24-po-26-noyabrya-v-respublike-tadzhikistan-prokhodyat-dni-kultury-belarusi/
[329] https://www.kultura.by/news/28-noyabrya-sostoyalos-zasedanie-kollegii-ministerstva-kultury-respubliki-belarus-na-baze-minskogo-o/
[330] https://t.me/MinobrofBelarus

| | |
|---|---|
| Беларуская | 17 |
| Абедзве | 4 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 23 навіны;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 13 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 28 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***

- правёў сустрэчу з калектывам Вялікага тэатра Беларусі. Асноўнай тэмай сталі маючыя адбыцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[331,332]. Пасля сустрэчы правёў у тэатры прыём грамадзян па асабістых пытаннях[333], пабываў на рэпетыцыі прэм’ернай оперы Чайкоўскага «Яўген Анегін» сімфанічнага аркестра Вялікага тэатра[334].

- прыняў удзел ва ўрачыстай сустрэчы ў дзень праваслаўнага свята абраза Божай Маці «Скорапаслушніца», якая адбылася ў Нацыянальным мастацкім музеі. У цэнтры ўвагі былі пытанні супрацоўніцтва Міністэрства культуры і Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама сумесныя праекты і планы на 2025 год[335,336,337].

- прыняў удзел у Пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на базе Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне. Размова ішла аб рабоце тэатральна-відовішчных арганізацый ва ўмовах пераходу на новы механізм фінансавання[338,339].

- накіраваў словы віншавання ансамблю «Песняры», таксама агучыў віншаванне ад Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Рамана Галоўчанкі[340].

***Першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада:***

- прыняў удзел у мерапрыемствах у рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Таджыкістан, дзе сустрэўся з Міністрам культуры Рэспублікі Таджыкістан: *«У апошнія гады супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі развіваецца дастаткова актыўна і*

[331] https://t.me/minkultrb/45519
[332] https://t.me/minkultrb/45529
[333] https://t.me/minkultrb/45530
[334] https://t.me/minkultrb/45531
[335] https://t.me/minkultrb/45632
[336] https://t.me/minkultrb/45636
[337] https://t.me/minkultrb/45638
[338] https://t.me/minkultrb/46018
[339] https://t.me/minkultrb/46035
[340] https://t.me/minkultrb/46219

*дынамічна, у тым ліку і таму, што ў нас шмат агульнага — пытанні гістарычнай памяці, 80-годдзе Вялікай Перамогі, якое мае адбыцца»*[341,342,343].

- накіраваў віншаванне Мінскаму дзяржаўнаму музычнаму каледжу ім. М. І. Глінкі са 100-гадовым юбілеем[344].

***Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Кацярына Усава:***

- павіншавала калектыў Белдзяржфілармоніі з нагоды 40-годдзя Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі “Свята”» і ўручыла ўзнагароды Міністэрства культуры[345].

- прыняла ўдзел у сустрэчы з маладымі рэжысёрамі з рэгіёнаў і студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва ў рамках «Марафона адзінства» ў Магілёве[346].

- правяла сустрэчу з супрацоўнікамі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Асноўная тэма, якую абмеркавалі ў межах сустрэчы: «Выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Будучыня залежыць ад нас»[347].

- прыняла ўдзел у Пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на базе Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне[348].

***Намеснік начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Слесарчык:***

- прыняў удзел у рэспубліканскім фестывалі патрыятычнай песні «Сэрцам маюць дачыненне» ў Оршы[349].

***Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дашчынская:***

- правяла «прамую тэлефонную лінію» па пытаннях аховы аб’ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцяў[350].

***Начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Марына Юркевіч:***

---

[341] https://t.me/minkultrb/45764
[342] https://t.me/minkultrb/45767
[343] https://t.me/minkultrb/45768
[344] https://t.me/minkultrb/46162
[345] https://t.me/minkultrb/45575
[346] https://t.me/minkultrb/45731
[347] https://t.me/minkultrb/46125
[348] https://t.me/minkultrb/46029
[349] https://t.me/minkultrb/45719
[350] https://t.me/minkultrb/46041

- прыняла ўдзел у Пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на базе Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне[351].

***Начальнік фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Святлана Крупко:***

- прыняла ўдзел у Пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на базе Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне[352].

- правяла сустрэчу з супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Асноўная тэма, якую абмеркавалі ў межах сустрэчы: «Выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Будучыня залежыць ад нас»[353].

***Начальнік аддзела бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ала Гурыновіч:***

- правяла сустрэчу з супрацоўнікамі Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур. Асноўная тэма, якую абмеркавалі ў межах сустрэчы: «Выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Будучыня залежыць ад нас»[354].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- У БДУКіМ завяршыўся І Рэспубліканскі конкурс чытальнікаў, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Вялікай Перамогі. Арганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў[355,356].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 28 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 15 навін;

Таджыкістан — 11 навін;

Кітай — 1 навіна;

Кыргызстан — 1 навіна.

***Расія:***

---

351 https://t.me/minkultrb/46035
352 https://t.me/minkultrb/46037
353 https://t.me/minkultrb/46076
354 https://t.me/minkultrb/46083
355 https://t.me/minkultrb/45553
356 https://t.me/minkultrb/45571

- дэлегацыя Рэспублікі Беларусь прыняла ўдзел у III Адкрытых маладзёжных Арктычных Дэльфійскіх гульнях, якія прайшлі ў г. Сыктыўкар (Рэспубліка Комі, Расійская Федэрацыя)[357,358,359,360,361].

- у Волагдзе (Расія) адкрылі помнік ансамблю «Песняры» за песню аб Волагдзе[362].

- у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася выстава «Дарога да міру», падрыхтаваная ў межах супрацоўніцтва паміж Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і Дзяржаўным музеем гісторыі расійскай літаратуры імя У. І. Даля (Масква). Праект прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Вялікай Перамогі[363,364].

- у Казанскім Крамлі адкрылася банерная выстава, прысвечаная Нясвіжскаму замку[365].

- Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь удзельнічае ў маштабным выставачным праекце Музея Акадэміі мастацтваў (г. Санкт-Пецярбург) «Рэпін. Дэталі». Выстава праходзіць з 29 лістапада 2024 па 29 сакавіка 2025[366].

***Таджыкістан:***

- у Таджыкістане стартавалі Дні культуры Беларусі[367,368,369,370,371,372,373]. У праграме: паказы работ беларускіх кінематаграфістаў, літаратурна-дакументальная выстава «Крывёю сэрца», арганізаваная Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выступленні беларускіх артыстаў[374]. У Душанбэ ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Таджыкістан быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж установай «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія» і Дзяржаўнай установай «Дзяржаўная філармонія Таджыкістана» імя Акашарыфа Джураева[375].

***Кыргызстан:***

- у г. Бішкек Кыргызскай Рэспублікі прайшоў першы міжнародны фестываль «Спадчына», які стаў культурнай пляцоўкай для дыялогу паміж майстрамі народнай творчасці з 8 краін: Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Расіі, Узбекістана, Кыргызстана. Рэспубліку Беларусь на фестывалі прадставіў дырэктар дзіцячай школы мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г. Быхава, народны майстар Беларусі Ірына Кухціна[376].

---

[357] https://t.me/minkultrb/45729
[358] https://t.me/minkultrb/45777
[359] https://t.me/minkultrb/45783
[360] https://t.me/minkultrb/45792
[361] https://t.me/minkultrb/45812
[362] https://t.me/minkultrb/45741
[363] https://t.me/minkultrb/45776
[364] https://t.me/minkultrb/46142
[365] https://t.me/minkultrb/45845
[366] https://t.me/minkultrb/46038
[367] https://t.me/minkultrb/45762
[368] https://t.me/minkultrb/45772
[369] https://t.me/minkultrb/45779
[370] https://t.me/minkultrb/45781
[371] https://t.me/minkultrb/45785
[372] https://t.me/minkultrb/45814
[373] https://t.me/minkultrb/45826
[374] https://t.me/minkultrb/45764
[375] https://t.me/minkultrb/45770
[376] https://t.me/minkultrb/45828

**На што яшчэ варта звярнуць увагу:**

- шырокае асвятленне (45 навін) Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства». 22-23 лістапада акцыя прайшла ў Магілёве[377,378,379,380,381,382,383,384,385,386,387,388]. У рамках акцыі Магілёў наведала мабільная экспазіцыя «Наш абавязак — памятаць!»[389,390,391], працавала тэматычная выстава «Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 — ліпень 1944 гг.»[392,393,394]. 29-30 лістапада акцыя прайшла ў Віцебску[395,396,397,398,399,400,401,402]. Мабільная экспазіцыя «Наш абавязак — памятаць!» наведала таксама і Віцебск[403]. «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах» — пад такой назвай у рамках «Марафона адзінства» адкрылася інтэрактыўная выстава ў мастацкім музеі Віцебска[404].

- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё X Беларускіх Калядных адукацыйных чытанняў. Юбілейныя X Беларускія Калядныя адукацыйныя чытанні на тэму «80-годдзе Вялікай Перамогі: памяць і духоўны вопыт пакаленняў. Да 25-годдзя Саюзнай дзяржавы» — галоўны інтэлектуальны, асветніцкі і культурны форум Беларускай Праваслаўнай Царквы. З прывітальным словам да прысутных звярнуліся Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін, Міністр інфармацыі Марат Маркаў і інш[405].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову, перадаюць установам адукацыі і культуры камплекты кніг.

---

377 https://t.me/minkultrb/45552
378 https://t.me/minkultrb/45585
379 https://t.me/minkultrb/45610
380 https://t.me/minkultrb/45623
381 https://t.me/minkultrb/45660
382 https://t.me/minkultrb/45661
383 https://t.me/minkultrb/45677
384 https://t.me/minkultrb/45682
385 https://t.me/minkultrb/45702
386 https://t.me/minkultrb/45718
387 https://t.me/minkultrb/45727
388 https://t.me/minkultrb/45732
389 https://t.me/minkultrb/45514
390 https://t.me/minkultrb/45678
391 https://t.me/minkultrb/46195
392 https://t.me/minkultrb/45584
393 https://t.me/minkultrb/45644
394 https://t.me/minkultrb/45645
395 https://t.me/minkultrb/45866
396 https://t.me/minkultrb/45868
397 https://t.me/minkultrb/45993
398 https://t.me/minkultrb/46088
399 https://t.me/minkultrb/46096
400 https://t.me/minkultrb/46163
401 https://t.me/minkultrb/46173
402 https://t.me/minkultrb/46185
403 https://t.me/minkultrb/46057
404 https://t.me/minkultrb/46108
405 https://t.me/minkultrb/46048

У перыяд з 21 па 30 лістапада 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- адкрыццё Цэнтра дадатковай адукацыі на базе Рускага Дома ў Мінску.** Праца Цэнтра дадатковай адукацыі будзе прысвечана паглыбленаму вывучэнню рускай мовы і іншых агульнаадукацыйных прадметаў. Таксама тут працягне функцыянаваць Школа творчага майстэрства[406].

**- адкрыццё культурна-адукацыйнага і навуковага форуму «Славянскія сустрэчы»** *(ГДУ імя Ф. Скарыны, Гомель).* Мерапрыемства праводзіцца пры падтрымцы Расійскага цэнтра навукі і культуры ў Гомелі. Кіраўнік Рускага Дома ў Гомелі Аляксандр Маржухін заявіў, што форум *«спрыяе ўмацаванню нашых шматгадовых сувязей».* Традыцыйна вынікам міжнароднага мерапрыемства пры садзейнічанні Рускага Дома ў Гомелі стане выданне зборніка навукова-даследчых артыкулаў удзельнікаў[407,408].

**- падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і Віцебскай абласной бібліятэкай імя Леніна.** Кіраўнік Прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Юрый Макушын падкрэсліў важнасць сумеснай работы з культурна-адукацыйнымі ўстановамі, а таксама спадзяецца на далейшае ўмацаванне супрацоўніцтва і адкрыццё на базе Бібліятэкі сумеснага Цэнтра рускай мовы і культуры[409].

**- аўтапрабег, прысвечаны 81-й гадавіне вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў** *(Гомель).* Арганізатарам аўтапрабегу выступіла РГА «Патрыёты Беларусі». Актыўны ўдзел у гэтай падзеі прыняў кіраўнік Рускага Дома ў Гомелі Аляксандр Маржухін[410].

**- конкурс сачыненняў «Без тэрміну даўнасці».** Конкурс праводзіцца з мэтай захавання гістарычнай памяці аб трагедыі мірнага насельніцтва СССР — ахвярах ваенных злачынстваў нацыстаў і іх памагатых у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг. Да ўдзелу запрашаюцца ў тым ліку навучэнцы адукацыйных арганізацый Рэспублікі Беларусь[411].

**- чарговая сустрэча размоўнага клуба «Рускі як замежны»** *(Рускі Дом у Гомелі)*[412,413].

**- праект «Кінаўрокі ў школах Расіі і свету» ў Гродзенскай вобласці** *(Рускі Дом у Гродне).* У ходзе рабочай сустрэчы з афіцыйным прадстаўніком АНО Цэнтр развіцця інтэлектуальных і творчых здольнасцей «Інтэлрост» у Рэспубліцы Беларусь Дзмітрыем Чабурканавым былі закрануты пытанні рэалізацыі ў Гродне некамерцыйнага міжнароднага культурна-гуманітарнага праекта «Кінаўрокі ў школах Расіі і свету»[414].

**- адкрыццё «Восьмых Давыдаўскіх чытанняў» — круглага стала ў рамках урачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных памяці генерал-лейтэнанта, паэта-партызана, грамадскага дзеяча — Дзяніса Давыдава** *(Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна).* Гэтым разам на базе Ваўкавыскага музея адбыўся круглы стол «Князь Пётр

---

[406] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15680
[407] https://t.me/russiangomel/5494
[408] https://t.me/russiangomel/5504
[409] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15688
[410] https://t.me/russiangomel/5489
[411] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/15660
[412] https://t.me/russiangomel/5478
[413] https://t.me/russiangomel/5488
[414] https://t.me/russkiydomvgrodno/2442

Іванавіч Баграціён у Ваўкавыску. Другая Заходняя армія на пачатку кампаніі 1812 года»[415,416,417].

**- сустрэча членаў Гістарычнага клуба** *(Рускі Дом у Гродне).* Падчас сустрэчы школьнікам расказалі пра дзейнасць ІВА «Баграціён», жыццё і подзвігі Пятра Баграціёна, а таксама бітвы, што разгарнуліся на Гродзенскіх землях падчас вайны 1812 года[418].

**- паход па мясцінах, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны на зямлі Брэстчыны.** Мерапрыемства прайшло пры падтрымцы Рускага Дома ў Брэсце[419].

**- выставы:**

- **«І сэрца б'ецца ва ўпаенні…» да 225-годдзю з дня нараджэння Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна** *(Рускі Дом у Гомелі)*[420].
- **выстава памяці Фёдара Іванавіча Цютчава** *(Рускі Дом у Гродне).* У рамках мерапрыемства была арганізавана дыялогавая пляцоўка «Жыццё і творчасць Ф. І. Цютчава» з удзелам студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы[421].
- **выставачныя праекты «Як сэрцу выказаць сябе...» і «Славянскі свет стуліцца цясней...»** *(Рускі Дом у Гродне).* Выставы былі падрыхтаваны супрацоўнікамі музея-запаведніка Ф. І. Цютчава «Аўстуг»[422].
- **выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў рамках праекта «Культурны код народаў Расіі і Беларусі»** *(клуб «Берагіня», Рускі Дом у Брэсце)*[423].
- **«Бітва за Маскву. Неўміручасць подзвігу»** *(Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»).* На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця выступілі дырэктар Мемарыяльнага комплекса А. Коркатадзе, намеснік дырэктара Дзяржаўнага музея абароны Масквы А. Лучкін, старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму» У. Сёмачкін і віцэ-консул Генеральнага консульства Расіі ў Брэсце С. Лапцеў[424].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 21-30 лістапада 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

[415] https://t.me/russkiydomvgrodno/2495
[416] https://t.me/russkiydomvgrodno/2506
[417] https://t.me/russkiydomvgrodno/2527
[418] https://t.me/russkiydomvgrodno/2528
[419] https://t.me/rcnkbrest/25353
[420] https://t.me/russiangomel/5535
[421] https://t.me/russkiydomvgrodno/2473
[422] https://t.me/russkiydomvgrodno/2487
[423] https://t.me/rcnkbrest/25322
[424] https://t.me/rcnkbrest/25383

***

**Згодна з дакументамі, падрыхтаванымі Расійскім інстытутам стратэгічных даследаванняў, расійскія чыноўнікі намагаюцца перапісаць гісторыю Беларусі ў сваіх інтарэсах.**

У распараджэнне беларускіх журналістаў-расследавальнікаў «Бюро Медыя» трапілі копіі аналітычных запісак за 2022-2024 гады па гістарычнай палітыцы Беларусі, падрыхтаваных Расійскім інстытутам стратэгічных даследаванняў (РІСД). У інтарэсах Расіі *«фарміраванне гістарычнай самасвядомасці беларусаў як прадстаўнікоў рускай цывілізацыі, а не як тых, хто жыве паміж Усходам і Захадам»,* — сказана ў аналітычнай запісцы за гэты год. Расійскі інстытут падрыхтаваў падрабязную інструкцыю, як гэтага дабіцца. Некаторыя з пунктаў ужо рэалізаваныя на практыцы. Расія хоча пашыраць працу з беларускімі гісторыкамі-заходнерусістамі, падтрымліваць іх грантамі, аплачваць стажыроўкі ў расійскіх архівах, мэтава фінансаваць спецыялізаваныя выданні, грамадска-інфармацыйныя праекты. У якасці вучонага прарасійскай арыентацыі называюць дэпутата і гендырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Вадзіма Гігіна. А вось гісторык-дэпутат Ігар Марзалюк крытыкуецца ў дакументах РІСД за *«радыкальна прапольскія погляды»* на беларускую гісторыю. Сярод мерапрыемстваў, прапісаных у інструкцыі, — увядзенне новага свята — Дня адзінства. Святкаваць яго прапануюць 24 кастрычніка, у дзень, калі ў 1795 годзе быў праведзены трэці падзел Рэчы Паспалітай, і беларускія землі канчаткова ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі[425,426].

***

**Дэпутата Ігара Марзалюка раздражняе мантра «у нас единая история, у нас единый язык».**

Дэпутат і член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук выказаў свой погляд на супольную гісторыі народаў Украіны, Расіі і Беларусі. *«Немагчыма адмовіць хрышчэнне ў дняпроўскай купелі. Беларусы, як і рускія, як і ўкраінцы, гэта народы ўсходнееўрапейскай, усходнехрысціянскай цывілізацыі»,* — заявіў Ігар Марзалюк у эфіры праграмы «Скажінемолчі» на БТ. *«Пры гэтым, хачу сказаць, мяне, мякка кажучы, раздражняе гэтая мантра: "у нас единая история", "у нас единый язык". У нас самабытная беларуская гісторыя, у нас самабытная беларуская мова, якая ў выніку неспрыяльных умоў, калі з нас хацелі зрабіць большых палякаў, чым самі палякі, а потым большых велікаросаў чым самі велікаросы, пэўныя свае пазіцыі страціла»*[427].

***

**У Мінскай гарадской ратушы адкрылася выстава «Саюзная крэпасць».**

Экспазіцыя прысвечана спадчыне абарончай архітэктуры Беларусі і Расіі. У ёй прадстаўлены крэпасці і замкі, умацаваныя храмы і манастыры Смаленшчыны і Беларусі[428].

---

425 https://buromedia.io/be/news/istoriya-belarusi-na-rossiyskiy-lad
426 https://nashaniva.com/356253
427 https://nashaniva.com/355787
428 https://t.me/minsknews_by/86600

***

**Інстытут «Палітычная сфера» прэзентаваў сваё даследаванне «Помнікі Мінска і абласцей: ці адпавядаюць яны нацыянальнай гісторыі і што кажуць пра ўзровень русіфікацыі?».**

У Мінску былі прааналізаваныя 765 аб’ектаў, у пяці абласных цэнтрах — 868. Аказалася, што большасць помнікаў, што ў Мінску, што ў рэгіёнах прысвечаныя гістарычным постацям і падзеям XX стагоддзя. У абласных цэнтрах у помніках, прысвечаных XIX стагоддзю відавочнае дамінаванне расійскага гістарычнага наратыву. Гэта помнікі Гогалю, Пушкіну — яны ёсць амаль у кожным буйным горадзе. Большасць помнікаў, якія ўшаноўваюць падзеі XX стагоддзя, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. 10% мінскіх помнікаў прысвечаныя Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. У абласных цэнтрах сітуацыя больш сумная — там ВАВ дамінуе абсалютна[429].

***

**Мінскія ўлады прадпісваюць упрыгожваць навагоднія вітрыны толькі «элементамі славянскага паходжання» і забараняюць уключаць у мінскіх гандлёвых цэнтрах і кавярнях сусветныя навагоднія хіты.**

Мінгарвыканкам разаслаў у сталічныя арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання прадпісанні наконт навагодніх упрыгожанняў. Цяпер у дэкоры вітаюцца толькі *«элементы славянскага паходжання».* Пажаданні такія — гэта павінны быць *«сімвалы, элементы славянскага паходжання, у тым ліку выявы Дзеда Мароза і Снягуркі, якія не супярэчаць гістарычным, культурным і духоўным традыцыям беларускага народа»*[430]. Наконт фонавай музыкі для магазінаў і кафэ ў Мінгарвыканкама таксама ёсць пажаданні. Мелодыі трэба ўзяць з плэйліста, *«сфармаванага Міністэрствам культуры».* Да дакумента прыкладаецца спасылка на Google-дыск, дзе можна спампаваць больш за 160 трэкаў. У папку не трапіла ніводнай англамоўнай кампазіцыі[431].

***

**Міністэрства інфармацыі склала спіс з 35 кніг, якія, на думку чыноўнікаў, наносяць «шкоду нацыянальным інтарэсам нашай краіны».**

Да такой высновы прыйшла Рэспубліканская камісія па правядзенні ацэнкі сімволікі, атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі[432,433]. Сярод забароненых выданняў: Нарыс гісторыі Беларусі (1795 — 2002). — Мн.: «Энцыклапедыкс», 2003; Тайны белорусской истории / Деружинский Вадим. — Минск: ФУАинформ, 2011; Цвірка, К. На скрыжалях вякоў: гістарычныя творы / Кастусь Цвірка. — Мінск: Харвест, 2018 і інш[434,435]. Тым часам Міністр

[429] https://nashaniva.com/355894
[430] https://nashaniva.com/356363
[431] https://nashaniva.com/356410
[432] http://mininform.gov.by/documents/spisok-pechatnykh-izdaniy-soderzhashchikh-informatsionnye-soobshcheniya-i-ili-materialy-rasprostrane/
[433] https://reformby.org/mininform-zapretil-35-pechatnyh-izdanij
[434] https://nashaniva.com/355834
[435] https://www.svaboda.org/a/33211961.html

інфармацыі Марат Маркаў анансаваў зацвярджэнне нарматыўных дакументаў, якія дазваляюць пазбавіцца літаратуры, якая не падабаецца ўладам[436].

***

**Вядомага краязнаўцу з Веткаўскага музея Аляксандра Нікіціна асудзілі ў Гомелі.**

Былы супрацоўнік Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Шклярава, экскурсавод Аляксандр Нікіцін быў асуджаны да пазбаўлення волі па абвінавачванні ва ўдзеле ў пратэстах. Аляксандра асудзілі ў канцы верасня па ч. 1 арт. 342 КК (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх). Аляксандра называлі *«легендай Веткаўскага музея», «любімым экскурсаводам»*[437].

***

**У Купалаўскім тэатры адбылася першая прэм’ера сезона. Гэта трагікамедыя Дастаеўскага з Няфёдавай у галоўнай ролі ў пастаноўцы расійскага рэжысёра.**

Першай прэм’ерай 105-га тэатральнага сезона ў Купалаўскім тэатры стаў спектакль «Дзядзечкаў сон» паводле Дастаеўскага. Працаваць над ім зноў запрасілі расійскага рэжысёра Дзмітрыя Акімава — раней ён ставіў у Купалаўскім «А зоры тут ціхія»[438].

---

436 https://reformby.org/markov-hochet-nemnozhko-ochistitsja-literatury-rasshativajushhej-iskonnye-nacionalnye-ustoi
437 https://nashaniva.com/355768
438 https://nashaniva.com/355964